Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ВЕРАСНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 171 (30305)

ТРЭБА ЕХАЦЬ... У МІНСК НА СВЯТА 7

ПЕРШЫЯ ГЕРОІ Ў БАЯХ ПАД МАДРЫДАМ 12-13

КАРАТКА

• Магчымасці закупак прадукцыі дрэваапрацоўчай прамысловасці Беларусі на таргах Беларускай універсальнай таварнай біржы былі прадстаўлены на Міжнароднай канферэнцыі па супрацоўніцтве ў сферы вытворчасці тавараў для дома і будаўнічых матэрыялаў Кітая і Цэнтральнай Азіі, якая прайшла ў Сіяне (КНР).

• **За тыдзень Беларусь наведалі больш за 4 тыс. еўрапейцаў.**

• Самым загружаным напрамкам для фур застаецца літоўскі: 1480 грузавікоў чакаюць уезду.

• **Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў дзейнічаюць ва ўсіх раёнах Беларусі, акрамя чатырох.**

• Беларускія школьнікі з 1 верасня могуць бясплатна ездзіць у гарадскім грамадскім транспарце.

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля ПЯТКЕВІЧ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Нам трэба ўжо адыходзіць ад разумення, што ўсё павінна дзяржава: усё ж і бізнес павінен прыходзіць не толькі ў буйныя гарады, але і ў невялікія населеныя пункты, таму што на развіццё агульнай інфраструктуры павінны працаваць усе. Мы павінны разумець, што разам будуем нашу краіну. І калі такое дзяржаўна-прыватнае партнёрства будзе і ў гэтым аспекце, то перастануць прад'яўляцца прэтэнзіі, бо гэта наша агульная справа: тут жывём мы, нашы дзеці і бацькі. Дык давайце ствараць гэтую інфраструктуру разам».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Наспела тэма для сур'ёзнай размовы з пакаленнем, якому трэба будзе прадоўжыць гістарычны шлях Беларусі»

Чаму Прэзідэнту важна размаўляць з моладдзю — акцэнты сустрэчы з віцебскімі студэнтамі

Фота Белта.

Восень пачынаецца ўрачыста для ўсіх навучэнцаў. Але для студэнтаў Віцебскай вобласці сёлетні Дзень ведаў асаблівы. Новы навучальны год для іх пачынаецца Адкрытым мікрафонам з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Святочная сустрэча, на якой падымаліся сур'ёзныя і актуальныя тэмы, прайшла на базе Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава быў заснаваны ў 1910 годзе. Сёння ВНУ ўключае 10 факультэтаў, 28 кафедраў, інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, ваенную кафедру, два каледжы, ліцэй, аспірантуру, навуковую бібліятэку. Ва ўніверсітэце навучаецца 9,5 тысячы студэнтаў, якія набываюць прафесіі па 17 профілях і больш чым 100 спецыяльнасцях. Рэктар Валянціна Багатырова далажыла Прэзідэнту пра тое, чым жыве ўніверсітэт. Але Аляксандра Лукашэнку, як заўсёды, найперш цікавілі праблемы і недахопы. Не абышлося і без заўваг. Напрыклад, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на назву факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый, які раней быў філалагічным. «Мы часам разумнічаць пачынаем на роўным месцы», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што трэба называць рэчы сваімі імёнамі. «Трэба быць больш простымі, каб людзі нас разумелі», — заўважыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы цікавіўся рознымі аспектамі жыцця ўніверсітэта: выкананне плана набору, забеспячэнне студэнтаў месцамі ў інтэрнатах, новыя спецыяльнасці. Валянціна Багатырова расказала, што на базе ВНУ распрацоўваюцца новыя навуковыя кірункі. Напрыклад, цяпер Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт сумесна з Віцебскім медыцынскім універсітэтам развіваюць такі запатрабаваны сучасны кірунак, як IT-медыцына. Ёсць сур'ёзныя напрацоўкі ў галіне біяхіміі, біятэхналогій, экалогіі. «Ёсць усе магчымасці і для актыўнага грамадскага жыцця, заняткаў фізкультурай і спортам. «Стадыён — мара», — сказала рэктар Валянціна Багатырова, падзякаваўшы Прэзідэнту за падтрымку. А затым дзякаваў Прэзідэнт — яму падарылі новы падручнік «Сучасная палітэканомія». «Якое месца ў гэтай сучаснай палітэканоміі займае марксісцка-ленінская?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. «Першае і галоўнае», — заявіла рэктар. Яна растлумачыла, што сама эканаміст па адукацыі, але падыходы, па якіх на працягу больш за два дзясяткі гадоў вучаць у ВНУ студэнтаў, часта не працуюць. Бо беларуская эканоміка — рэгуляваная ў адрозненне ад тэорыі самарэгулявальных рынкаў. Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым заўважыў, што і ў іншых краінах эканоміка таксама рэгулюецца. Напрыклад, цяпер Камалу Харыс у ЗША якраз крытыкуюць за прапанову рэгуляваць цэны.

У фае ўніверсітэта Прэзідэнт азнаёміўся з найлепшымі дасягненнямі ВНУ Віцебскай вобласці. Тут былі прадстаўлены такія галіны, як медыцына, нафтахімічная і тэкстыльная галіны, ветэрынарыя. І галоўнае, што тут цікавіла кіраўніка дзяржавы, — наколькі навуковыя распрацоўкі ўніверсітэтаў актуальныя для рэальнага сектара эканомікі і як яны прымяняюцца ў практычнай дзейнасці. Аляксандра Лукашэнку прывіталі студэнты з Кітая, якія падарылі яму спецыяльную грамату з каліграфічным надпісам на кітайскай мове. У ёй — пажаданні здароўя, дабрабыту і працвітання.

Настрой сустрэчы Аляксандр Лукашэнка задаў адразу — адкрыты і душэўны. Таму Прэзідэнт адышоў ад плана і першай даў слова рэктару Валянціне Багатыровай. Яна адзначыла, што гэту сустрэчу доўга чакаў увесь універсітэт. Паводле яе слоў, гэты дзень увойдзе ў гісторыю Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта. І, скарыстаўшыся магчымасцю, задала кіраўніку дзяржавы пытанне, якое, відавочна, хвалюе многіх беларусаў: «Як вы ўсё паспяваеце?»

СТАР. 2-3

Крыніца духоўнасці

СЭРЦЫ, АДКРЫТЫЯ СЛОВУ

У Івацэвічах прайшоў Дзень беларускага пісьменства

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Хоць Івацэвічы — гарадок невялікі па памерах, але ж адметны цікавай гісторыяй, а таксама слаўны сваімі выхадцамі, сярод якіх нямала літаратараў, навукоўцаў, людзей мастацтва. Іх спадчына і стварыла пэўны духоўны падмурак сёлетняга святкавання. Важна адзначыць, як памаладзелі, папрыгажэлі Івацэвічы. Цэнтральная частка горада прывабліве нейкім асаблівым глянцам, многа змянілася да лепшага падчас падрыхтоўкі ў розных кутках горада.

СТАР. 8-9

Актуальна

ПАШПАРТ ДЛЯ КАЦЕЛЬНІ

У сталіцы завяршаюць падрыхтоўку да ацяпляльнага сезона

Усе аб'екты энергетыкі, ЖКГ і сацыяльнай сферы сталіцы падрыхтаваны да асенне-зімовага перыяду, усе яны атрымалі пашпарты гатоўнасці. Летам праведзены рамонт ацяпляльных сістэм і электраабсталявання, воданагравальнікаў, цыркуляцыйных помпаў і цеплаізаляцыі. Завяршаюцца работы па рамонце дахаў, стыкаў, балконаў у жылых дамах, а таксама сістэм водаадвядзення, уцяпленне канструкцый агароджвання.

СТАР. 11

«Наспела тэма для сур'ёзнай размовы з пакаленнем,

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

«Добра працуе прэс-сакратар. Мы яшчэ нічога не зрабілі, а «Пул першага» ўжо забіты навінамі», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Выкарыстоўваючы свой выкладчыцкі вопыт, кіраўнік дзяржавы арыентаваў аўдыторыю на сумленную размову, без фармалізму. Разам з тым тэмы ўзнімаліся сур'ёзныя.

Мэта — ператварыць Беларусь у гарачую кропку

Звяртаючыся да прысутных, беларускі лідар падкрэсліў, што сёння ў Віцебскага ўніверсітэта асаблівы дзень. І не толькі таму, што сюды прыехаў Прэзідэнт. «Я, мабыць, упершыню ў вашай ВНУ. Хаця, улічваючы, што ў нас паўсотні ВНУ і іншых навучальных устаноў, нават за маё доўгае прэзідэнцкае жыццё не так проста іх аб'ехаць і наведаць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што падчас нарады з саветам рэктараў у лютым папрасіў спланаваць наведванне ВНУ як у сталіцы, так і ў рэгіёнах.

Акрамя таго, па словах Прэзідэнта, наспела тэма для сур'ёзнай размовы з пакаленнем, якому трэба будзе прадоўжыць гістарычны шлях Беларусі ў свеце, што змяняецца з шалёнай хуткасцю. «Свет змяніўся, падзеі адбываюцца хутка — тэмп касмічны. Вы, мабыць, адчуваеце такі тэмп? Калі не, то, стаўшы студэнтамі, ужо адчулі. Тое, што на ўчарашнія інавацыі сёння мы глядзім як на музейны экспанат, вы таксама адчулі. Размова не толькі аб навуцы, тэхналогіях і рэальным сектары эканомікі. Гэта датычыцца і сацыяльнай сферы, адносін паміж людзьмі ў грамадстве», — адзначыў ён. Аднак, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, праблема не ў хуткасці, а ў тым, што краіны і народы ўцягнуты ў гонку за валоданне тэхналогіямі. «Нічога новага. Усё нібыта па-ранейшаму. Але з нюансамі, — заўважыў ён. — Цяперашняя барацьба за сусветнае тэхналагічнае лідарства, як і гонка ўзбраенняў у другой палове мінулага стагоддзя, зноў падвяла свет да краю прорвы. У той ці іншай частцы свету ўжо іскрыць, дзесьці супрацьстаянне ідзе са зброяй у руках. Вельмі шкада, што гэта зусім побач з намі. І нават не побач, а ў нас. Мы разумеем: тэхналагічныя манапалісты ў асобе заходніх дзяржаў зробяць усё, каб не дапусціць трансферу ведаў і тэхналогій у дзяржавы, якія развіваюцца». Па словах беларускага лідара, для калектыўнага Захаду гэтыя краіны — пастаўшчыкі працоўнай сілы і рынкі збыту. Нешта падобнае на неакаланіялізм у чыстым выглядзе. «Трэба разумець, што ўвядзенне незаконных санкцый, розныя рэстрыкцыі, росквіт шавіністычных, нацыяналістычных і іншых разбуральных ідэалогій на Захадзе — гэта звёны аднаго ланцуга, падпарадкаваныя адзінай мэце — усімі сіламі захаваць светапарадак, заснаваны на іх правілах. Правілах, якія забяспечваюць ім сытае жыццё за наш з вамі кошт і кошт іншых краін, якія развіваюцца. І нас уцягваюць у дадзенае супрацьстаянне. Пакуль у сферах эканомікі, навукі і тэхналогій. Але мэта — ператварыць Беларусь у яшчэ адну гарачую кропку на карце свету», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

«Паспрабуюць больш жорстка з намі абысціся — будзе адказ»

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што многія часта захапляюцца Злучанымі Штатамі Амерыкі, бо многія тэхналогіі зараджаліся менавіта там. Аднак, па яго словах, ёсць невялікі нюанс. «Друкуюць грошы — яны могуць укінуць у развіццё любыя грошы. Яны дасягнулі за кошт гэтага пэўных рэсурсаў. Яны, як пыласос, з усяго свету выцягвалі найлепшыя розумы, плацілі ім добрыя грошы, і яны развівалі гэтыя тэхналогіі», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. У той жа час, па словах беларускага лідара, США вядуць войны і ўцягваюць у канфлікты іншыя краіны. У прыклад ён прывёў Германію: «Ужо прадпрыемствы, якія працавалі ў Германіі, пайшлі натоўпам у Злучаныя Штаты Амерыкі. Чаму? Таму што яны стварылі там добрыя ўмовы. І таму што яны пасля Другой сусветнай вайны сталі шмат у чым манапалістамі і магутнай дзяржавай — за наш кошт. За наш кошт яны вырабляюць амаль трэць сусветнага багацця. І пакуль долар яны манапалізавалі і друкуюць, да таго часу яны будуць перадавымі». Аднак Прэзідэнт звярнуў увагу, што з'яўляюцца іншыя буйныя гульцы, накшталт Кітая і Індыі, якія не згодны з цяперашнім светаўладкаваннем. Часам ЗША папракаюць іх у тым, што яны крадуць тэхналогіі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта не навіна. Ён нагадаў, як стваралася ядзерная зброя. Навукоўцы з ЗША, якія працавалі над гэтым, узялі распрацоўкі з Германіі. А Савецкі Саюз прыклаў намаганні, каб ЗША не сталі манапалістамі ў гэтай сферы. «А калі б гэтага не было? Калі б сёння не было савецкага ядзернага шчыта, які сканцэнтраваны ў Расіі, — нас бы не было. Сёння яны не ведаюць, што з намі рабіць: паспрабуюць больш жорстка абысціся — будзе адказ ядзерным ударам. Ад гэтага загіне ўся планета. А гінуць яны больш не жадаюць, таму што ў іх сытае і добрае жыццё — у тых, хто прымае гэтыя рашэнні», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

«Я хачу, каб вы разумелі ўсю сур'ёзнасць гістарычнага моманту»

Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння стаіць задача ў паскораным фармаце правесці новую навукова-тэхнічную рэвалюцыю, пакуль нас не ўцягнулі ва ўзброенае супрацьстаянне. «Толькі ў такіх умовах з'явіцца шанц захавацца як дзяржава і не дапусціць вялікай вайны на нашай зямлі. Гэта суровая праўда жыцця. І я хачу, каб вы разумелі ўсю сур'ёзнасць гістарычнага моманту. Паколькі заўтра вам працаваць на вытворчасці ці ў лабараторыі, рухаць наперад навуковую думку, мы разлічваем на вас. Разлічваем, што вы будзеце гатовы прыкласці каласальныя намаганні для дасягнення пастаўленай перад дзяржавай мэты», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму для першай падобнай сустрэчы са студэнтамі абраны менавіта Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава. Аказваецца, кіраўнік дзяржавы яшчэ ні разу не наведваў гэту ВНУ. «З іншага боку, я рады, што наша сустрэча праходзіць менавіта цяпер — у 80-годдзе вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Віцебскі ўніверсітэт займае асаблівае месца ў нашай гістарычнай памяці. Сярод выпускнікоў тры Героі Савецкага Саюза — Канстанцін Антонавіч Абазоўскі, Міхаіл Амосавіч Высагорац і Пётр Міронавіч Машэраў, імя якога носіць універсітэт. «І мяне радуе, што вы шануеце памяць сваіх папярэднікаў, захоўваеце пераемнасць пакаленняў, традыцыі. Вельмі хацелася б, каб вы трымалі ўзровень найлепшых ВНУ краіны і блізкага замежжа. Патэнцыял у вас сур'ёзны, і, думаю, вы можаце значна дадаць як у навукова-адукацыйнай дзейнасці, так і ў выхаваўчай рабоце», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Імкніцеся ў гэты час узяць максімум»

«Дарагія сябры! Пачынаецца новы навучальны год. Вы заўважылі, як літаральна за дзень уся краіна ды і ваш горад прыйшлі ў рух. Пачаліся ўрачыстыя лінейкі, хутка празвініць традыцыйны першы званок і больш за мільён школьнікаў і каля пяцісот тысяч навучэнцаў каледжаў і студэнтаў ВНУ пачнуць заняткі. Фактычна з сённяшняга дня мы ўсе пачынаем жыць па новым навучальным календары. Можа, у студэнтаў ужо не так яскрава адчуваецца пачатак новага навучальнага года ці, як вы кажаце, навучальнага семестра. Вы — людзі дарослыя. Але, упэўнены, гледзячы на малых з букетамі кветак, кожны з вас з цеплынёй успамінае школьныя дні, адкуль мы ўсе з вамі выйшлі», — сказаў беларускі лідар. Ён павіншаваў студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў з Днём ведаў. «Няхай гэты навучальны год будзе займальным, напоўненым новымі адкрыццямі, станоўчымі эмоцыямі, радасцю сустрэч з цікавымі людзьмі. Насычайцеся, як губка, ведамі і кампетэнцыямі, каб літаральна праз некалькі гадоў стаць прафесіяналамі сваёй справы, заняць годнае месца ў жыцці», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што студэнцтва — самы складаны перыяд жыцця. «Калі вы скончыце ВНУ, будзе значна лягчэй. Вы будзеце займацца сваёй любімай справай, спадзяюся, што любімай. Вы будзеце поўнасцю сканцэнтраваны на ёй. Вы будзеце здаваць экзамены, якія вам патрэбныя. У ВНУ ж так бывае: прыходзіш на экзамен толькі дзеля залікоўкі», — заўважыў Прэзідэнт. Ён успомніў, што часам здаецца, што не ўсе прадметы падчас вучобы патрэбны. «Імкніцеся ў гэты час узяць максімум», — параіў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, часта не хапае ведаў менавіта па тых прадметах, якія здаваліся «дзеля залікоўкі».

«Падручнік — гэта ікона». У чым яго роля для жыцця краіны

У сувязі з гэтым беларускі лідар нагадаў сваё патрабаванне пра якасны і зразумелы падручнік. Гэтае пытанне, як вядома, пастаянна знаходзіцца ў полі зроку Прэзідэнта. Па яго словах, падручнік — гэта ікона. «Падручнік — гэта галоўнае. Там павінна быць канцэнтрацыя ўсіх ведаў па прадмеце», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Акрамя таго, заўважыў беларускі лідар, калі матэрыял у падручніку выкладзены складана і кожны абзац трэба перачытваць некалькі разоў, каб зразумець сутнасць, то і цікавасць да прадмета губляецца. Менавіта па гэтых прычынах кіраўнік дзяржавы пільна сочыць за якасцю падручнікаў і патрабуе іх перарабляць, калі гэта трэба.

«Рэвалюцыі ў адукацыі скончыліся. Мы вельмі шмат навацый за гэтыя гады ўкаранялі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што пасля развалу Савецкага Саюза трэба было давесці да ладу ўсе сферы, уключаючы эканоміку, адукацыю і іншае. У такой сітуацыі найперш трэба было стварыць падручнікі, якія найбольш падыходзяць для беларускіх рэалій. У якасці прыкладу Прэзідэнт прывёў падручнік па эканоміцы, які выкладаў не тую эканамічную мадэль, якая развівалася ў краіне. «Трэба вучыць людзей таму, што ім трэба», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што беларускую адукацыю часта крытыкуюць. Але разам з тым многія краіны просяць і хочуць атрымаць сабе «беларуса з беларускай адукацыяй». І гэта датычыцца розных сфер. Па словах Прэзідэнта, паказальна і тое, што ў Беларусі цяпер вучацца больш за 30 тысяч замежных студэнтаў. У тым ліку з Кітая, дзе найвышэйшы ўзровень адукацыі. Паспяхова рэалізуюцца і сумесныя адукацыйныя праграмы беларускіх і кітайскіх універсітэтаў. Гэта дазваляе краінам абменьвацца досведам і кампетэнцыямі. «Яны не грэбуюць вучыцца па тых кірунках, дзе ўмеюць нешта рабіць. І добра ўмеюць. Яны разумеюць, што ў Беларусі нешта асаблівае ёсць — давайце возьмем і сабе прыцягнем», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння ідзе сур'ёзная барацьба за лідарства. Гэтая барацьба ідзе не толькі ў медыйнай прасторы ці эканоміцы, але і на полі бою. «Вайна ва Украіне — гэта таксама наша праблема. І ніякая там ужо не вайна паміж Расіяй і Украінай. Там вайна паміж Расіяй і тымі дзяржавамі, якія Расіі дапамагаюць (хоць няшмат, але дапамагаюць), і натаўскімі дзяржавамі, як мінімум. Таму нам трэба нямала зрабіць, каб гэтыя страшныя працэсы спыніць», — заявіў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што свет развіваецца па сваіх законах і будзе шматпалярным. Гэта вельмі складаны і напружаны час. І гэты цяжар кладзецца на плечы маладых людзей, у тым ліку і тых, хто знаходзіцца ў зале ВДУ імя П. М. Машэрава.

«Хочаце вы гэтага ці не, вам прыйдзецца жыць у гэтым свеце. Вам яго будаваць. Таму я заўсёды кажу з вышыні свайго досведу: лепей жыць бядней, чым ваяваць, як гэта адбываецца за межамі нашай краіны. Я казаў, што вайна ідзе не там, яна ідзе ў нас. І яшчэ, як Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі, хачу вас засцерагчы ад гэтага, каб вы не адчулі ваеннага напружання», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што ў найблізэйшы час: пяць—дзесяць гадоў — трэба дапамагчы моладзі ўзяць краіну ў свае рукі, каб і ў наступных пакаленняў былі добрыя ўмовы для жыцця.

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь сёння жыве ва ўмовах незаконных варварскіх санкцый. Нягледзячы на гэта, дзяржава развіваецца і людзі могуць жыць камфортна. «Трэба не забывацца, што гэта ўсё ствараецца нашымі з вамі рукамі. Гэта вы ствараеце, вашы бацькі. Будзе большая аддача ў эканоміцы — ніхто не раскрадзе, гэта будзе ваша. Але для гэтага трэба проста працаваць», — параіў моладзі беларускі лідар. Ён таксама параіў акуратна абыходзіцца з сусветным павуціннем. «Інтэрнэт — гэта найвялікшы здабытак чалавецтва. Хочам мы гэтага ці не. Але гэта вельмі сур'ёзная зброя ў руках тых, хто яе ствараў, і тых, хто ёй карыстаецца», — канстатаваў беларускі лідар. Паводле яго слоў, замацаваць у маладых людзей правільныя паняцці і каштоўнасці — задача выкладчыкаў. І даў ім параду: трэба тлумачыць студэнтам перавагі і недахопы, даваць глебу для разважанняў.

«ДАВАЙЦЕ ШЧЫРА ПАГАВОРЫМ»

На мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка абмяркоўваў пытанні і праблемы адукацыі з выкладчыкамі падчас Рэспубліканскага педагагічнага савета. У Дзень ведаў ён разважаў на гэтыя тэмы з тымі, для чыёй карысці і вырашаюцца гэтыя праблемы — з навучэнцамі. Маладыя людзі не ўпусцілі магчымасці і спыталі ў Прэзідэнта ўсё, што іх цікавіла. «Давайце шчыра пагаворым, калі сустрэліся», — пажадаў кіраўнік дзяржавы.

Дзе лепей: у сталіцы ці ў рэгіёне? Што раіць Прэзідэнт абітурыентам

11-класнік ліцэя ВДУ Вадзім Пахалок, які марыць стаць інжынерам, спытаў у Прэзідэнта парады — куды лепей паступаць: у сталічны універсітэт або рэгіянальны і ці адрозніваецца там узровень падрыхтоўкі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ён сам вучыўся ў рэгіянальных ВНУ — Магілёўскім універсітэце імя Куляшова, а затым у сельскагаспадарчай Акадэміі ў Горках. Паводле яго слоў, галоўным матывам было не месцазнаходжанне ўніверсітэта, а шчырае жаданне зрабіць нешта добрае для людзей, якія жывуць у сельскай мясцовасці. «Я разумеў, што толькі ў вёску павінен паехаць і ім нешта зрабіць. І я папрасіў сам: «Накіруйце мяне ў самы бедны калгас». Я кажу: «Я туды паеду, я вам абяцаю, што гэта будзе найлепшая гаспадарка», — успомніў Аляксандр Лукашэнка. Для таго каб выканаць сваё жаданне працаваць у сельскай гаспадарцы, прыйшлося паступаць у сельскагаспадарчую акадэмію. «Я заканчваў рэгіянальныя ВНУ і служыў сваёй краіне», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, няважна, дзе вучыцца. Праграмы, метадычкі, іншае практычна аднолькавыя па той ці іншай спецыяльнасці. «Выкладчыкі розныя, вядома, але я ўпэўнены, што ў рэгіянальных ВНУ выкладчыкі не горшыя, чым у мінскіх ВНУ», — адзначыў ён. Магчыма, нават лепш, таму што, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, у сталіцы з-за канкурэнцыі складаней замацавацца і многія едуць у рэгіёны, каб спакойна займацца навукай. Паводле слоў Прэзідэнта, у Віцебску створана выдатная вытворчая база. Рэгіён прамысловы, таму малады спецыяліст зможа без праблем знайсці сабе работу на любым прадпрыемстве.

Галоўнае — жаданне. «Калі ў цябе ёсць гэтае жаданне — боскае жаданне, не проста «я зараз скончу ВНУ, для сябе чагосьці зраблю і буду багатым» (гэта таксама нядрэнна, калі для сябе, для сям'і нешта зробіш). Галоўнае, каб ты хацеў людзям прынесці карысць», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка параіў маладым людзям не парыцца і не рвацца ў Мінск. «У Мінску цесна, ты чужы», — адзначыў ён. Кіраўнік дзяржавы падзяліўся сваім вопытам — як чалавек, які нарадзіўся ў вёсцы і сёння аддае перавагу жыццю за горадам. «Мая вам парада: не рвіцеся ў Мінск. Будзе ў вас жаданне, атрымаеце вы пэўныя веды — вас заўсёды заўважаць. Таму што ў нас жудасны дэфіцыт на такіх талковых людзей, якія хочуць нешта зрабіць... Не кажу для Радзімы, для краіны — для людзей, — заўважыў беларускі лідар. — Веды можна атрымаць і ў Беларускім дзяржуніверсітэце, і ва ўніверсітэце імя Машэрава».

Кіраўнік дзяржавы таксама заўважыў, што не трэба спяшацца адарвацца ад сям'і, ад бацькоў, якія шмат зрабілі і ўклалі для таго, каб маладыя людзі маглі атрымліваць вышэйшую адукацыю. «Мая табе парада. Калі б ты быў маім дзіцем, я б табе сказаў: заканчвай, вось ёсць рэгіянальная ВНУ, вось на тым прадпрыемстве... Добра, што ў цябе фізіка і матэматыка аснова, нам такіх маладых людзей заўсёды не хапае. І ты ў сваім жыцці знойдзеш дарогу», — параіў Аляксандр Лукашэнка. Тым больш, паводле яго слоў, разумных, талковых навучэнцаў у нашай краіне не губляюць. Дзейнічаюць фонды Прэзідэнта па падтрымцы адораных навучэнцаў, лаўрэатаў стыпендый якіх ведаюць і бачаць. «Мы не губляем разумных маладых людзей, — падкрэсліў беларускі лідар. — Галоўнае цяпер — атрымаць гэтую базу. Гэта цяжка, часам нудна. Часам адчуваеш, што, можа, і не трэба. Усё гэта патрэбна. Таму вучыцеся».

якому трэба будзе прадоўжыць гістарычны шлях Беларусі»

Аляксандр Лукашэнка таксама пералічыў апоры для чалавека, на якія арыентаваў і сваіх дзяцей не як Прэзідэнт, а як бацька: займацца спортам, ведаць англійскую мову, займацца музыкай (ці іншыя творчыя навыкі) і вучыцца. І абавязкова праца. «Не зазнавайцеся. Нідзе і ніколі», — параіў ён. Кіраўнік дзяржавы пажадаў сучасным і будучым студэнтам выбраць правільную любімую справу: «Галоўнае, каб ты ішоў туды, дзе ты можаш больш карысці прынесці і што табе будзе падабацца. Бяда, калі ідзеш на працу, а ісці не хочацца, ногі не ідуць. Праца павінна быць у задавальненне».

Людзі ствараюць міф вакол першых асоб — чаму ў Аляксандра Лукашэнкі няма куміраў

У Прэзідэнта спыталі, ці былі ў яго жыцці настаўнікі, якія дапамагаюць і накіроўваюць. «Калі шчыра, не. Я першы прэзідэнт Беларусі — на каго я буду раўняцца, калі прэзідэнтаў да мяне не было», — наўпрост адказаў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што нават не можа адказаць на пытанне, хто з гістарычных асоб больш падабаецца. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што раней называў Шарля дэ Голя, палітычнага дзеяча, які шмат зрабіў для Францыі. Але, стаўшы Прэзідэнтам, шмат каго даведаўся з рэальнага жыцця прэзідэнтаў. «Людзі ствараюць нейкі міф вакол першых асоб. Бывае, перабольшваюць. Не такія героі прэзідэнты, як звычайным людзям часам гэта здаецца, і нават не звычайным», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. І як гісторык па адукацыі ён звярнуў увагу, што часта гістарычных асоб, асабліва першых асоб дзяржавы, схільныя ідэалізаваць. У прыклад ён прывёў асобу Уладзіміра Леніна. «Я лічыў, што Ленін ідэальны чалавек, стваральнік дзяржавы. А калі я стаў прэзідэнтам і шмат чаго прачытаў, з архіва прачытаў, зразумеў, што там стварылі выяву. Хоць ён, вядома, велічыня, ён разумнік. Ён быў настолькі разумным і адукаваным чалавекам, што тэорыю лёгка на практыку пераносіў. Я яго вельмі паважаў. А калі больш даведаўся — перастаў ідэалізаваць», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка. Тое ж самае датычыцца і Іосіфа Сталіна, і Лаўрэнція Берыі, якіх прызвычаіліся абвінавачваць у жорсткіх рэпрэсіях, забываючыся пра карысць, якую яны прынеслі краіне. Ён заклікаў акуратна ставіцца да гісторыі, таму што яе часта «робяць» пад той момант, калі жылі тыя ці іншыя лідары і кіраўнікі дзяржаў. «Тое, ад чаго я спрабую зберагчы наша пакаленне. Асабліва інтэлігенцыю. Таму я інтэлігенцыю ніколі не захвальваю, не гладжу, грашыма не спакушаю. Ні ў якім разе», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, інтэлігенцыя схільная хваліць, узнімаць, а потым новы прэзідэнт будзе «на калена ламаць інтэлігенцыю», каб яны ўзнімалі ўжо яго перыяд працы.

«Трэба спакойна ўспрымаць гэту рэчаіснасць. Няхай лепш пра мяне добра скажуць, калі я не буду Прэзідэнтам. Гэта будзе добра. А калі ты ва ўладзе, пачынаюць цябе захваляваць твае падначаленыя — я няёмка сябе адчуваю, нават калі разумею, што гэтага заслугоўваю», — прызнаўся кіраўнік дзяржавы.

Веды і патрыятызм — якім павінен быць ідэальны студэнт

Сярод пытанняў былі і філасофскія. Напрыклад, хто такія ў разуменні Прэзідэнта настаўнікі. На словах кіраўніка дзяржавы, настаўнік павінен не толькі даць веды, але і паказаць, як прымяняць іх на практыцы, паказаць, як трэба жыць. Па просьбе ўдзельнікаў мерапрыемства, Аляксандр Лукашэнка падзяліўся сваім бачаннем ідэальнага студэнта: «Студэнт — гэта перш за ўсё веды. Па-другое — выхаванне. Вы павінны быць адукаванымі, наколькі гэта толькі магчыма. Галоўнае — быць патрыятычным чалавекам», — заявіў беларускі лідар. Ён даў яшчэ адну параду маладым — усё рабіць своечасова: «Таму што час пройдзе — у цябе з'явяцца новыя клопаты, новыя праблемы. З'явіцца сям'я, дзеткі, і табе вучыцца трэба будзе, бо ўсё жыццё трэба вучыцца, але часу ўжо менш. І ты павінен ведаць, што твая зямля тут. Ты яе ведаеш, ты яе разумееш». Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што сёння многія, хто з'ехалі за мяжу, просяцца назад, бо тут дом, а там яны чужыя, нікому не патрэбныя.

Працягваючы тэму студэнцтва, у Прэзідэнта пацікавіліся, якія стравы былі яго любімымі падчас вучобы ва ўніверсітэце. «Нічога дзіўнага. Малочны суп. Я вельмі шмат гаварыў аб гэтым раней. Цяпер я малочны суп практычна не ўжываю. Гавораць, суп з агародніны трэба есці», — адказаў кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, што гэта павялося яшчэ з вясковага жыцця, калі ў беднай сям'і самай даступнай ежай якраз быў малочны суп з рысам. Яшчэ Прэзідэнт любіць чорны хлеб.

Маладыя людзі згадалі і знакамітую салату «Маладосць», рэцэптам якой кіраўнік дзяржавы дзяліўся з усёй краінай. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што навукоўцы адзначылі карысць гэтай салаты, якая складаецца са свежай зялёнай цыбулі, агуркоў і смятаны. Ён прызнаўся, што любіць тое, да чаго прывык з дзяцінства. А да розных замежных прысмакаў ставіцца спакойна. «У нас дома ікру ніхто не есць», — прывёў ён прыклад.

Асабістых пытанняў было нямала. Студэнты спыталі, ці ёсць у Аляксандра Лукашэнкі мабільны тэлефон. «Няма і ніколі не было. Па многіх прычынах. Па-першае, мне гэта не трэба. Для таго каб перагаварыць (я вельмі рэдка па мабільным тэлефоне размаўляю), у мяне ёсць Служба бяспекі. У яе і ўрадавая сувязь, і тэлефоны ўсе — яны мне даложаць, я перагавару», — адказаў ён. Па яго словах, пра тое, што пішуць у інтэрнэце, таксама ёсць каму расказаць. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы не карыстаецца мабільным тэлефонам з-за пытанняў бяспекі.

Аляксандр Лукашэнка шчодра дзяліўся са студэнтамі сваімі ўспамінамі. Так, ён расказаў пра свае адчуванні, калі губернатар Магілёўскай вобласці Анатоль Ісачанка падарыў яму сшытак, які будучы Прэзідэнт вёў падчас працы ў саўгасе. «Я адчуў, што гэта самы лепшы падарунак, які мне дастаўся. Гэта рабочы сшытак», — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што сёння, аналізуючы тыя запісы, бачыць, што яго хвалявалі многія дзяржаўныя пытанні: колькі мяса павінен прадаць, колькі малака, а дзе чаго не выконваем. У тым жа сшытку змешчаны і тэзісы для выступленняў на розных мерапрыемствах. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што шмат у чым гэта былі «апазіцыйныя тэзісы», у якіх ён жорстка адстойваў сваю пазіцыю і выказваў меркаванні па тых ці іншых пытаннях. Прэзідэнт расказаў, што прамы і шчыры падыход да абмеркаванняў найважнейшых дзяржаўных пытанняў, прынцыповае адстойванне сваёй пазіцыі дапамаглі яму зрабіць такую палітычную кар'еру.

Галоўнае — гэта цярпенне. Прэзідэнт расказаў, як быць палітыкам

Палітычныя парады ад Прэзідэнта таксама цікавілі маладых людзей. Адно з пытанняў — як адрозніць праўду ад хлусні. «І не спрабуйце гэта рабіць. Вы ніколі не адрозніце. Таму што палітыка — гэта калі не хлусня, то пэўнае замоўчванне, недаказанасці. Палітыка — гэта тое, што робяць палітыкі (прабачце за таўталогію) для таго, каб яму самому, пэўнай групе ці народу было лепей», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што сам не хлусіць, але часам недагаворвае ці ўвогуле не выказвае свайго меркавання. «Я прыхільнік шчырай палітыкі. Прабачце за нясціпласць, але палітыкаў практычна няма такіх», — падкрэсліў беларускі лідар. Па яго словах, гэта правільна, але ў той жа час шчырыя выказванні могуць быць не на карысць. «У палітыцы часам лепш хлусню і праўду не шукаць. Гэта месцамі так пераплецена», — заўважыў ён.

Яшчэ адно палітычнае пытанне — як не паддавацца на правакацыю. «Трэба, па-першае, разумець сітуацыю і прадмет. А па-другое, не спяшацца. Вось цярпенне — гэта самае галоўнае. Я не ўзор у гэтым плане. Я больш эмацыйнальны: наперад, на барыкады, трэба ўвязацца ў бойку, а потым разбяромся. Часам так было. Але з узростам я ўжо так думаю: не, трэба перачакаць, трэба паглядзець, потым будзе відаць», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ў гэтым заключаецца беларуская памяркоўнасць. «Памяркоўнасць не нашкодзіць — гэта не заўсёды дрэнна. Але часам тармозіць прагрэс. Таму я перыядычна так і сяку з-за пляча. Галоўнае — цярпенне», — пераканаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт прызнаўся, што сам, калі нешта не поўнасцю разумее ў пэўнай сітуацыі, то, перш чым прыняць рашэнне, дасканала разбіраецца. А для гэтага патрэбна цярпенне. Нават калі вельмі складана. Ён прывёў у прыклад сітуацыю з пратэстамі 2020 года ў Мінску. Тады Прэзідэнту прапаноўвалі розныя варыянты дзеянняў, у тым ліку заклікалі «паказаць ім, хто там ходзіць, каля Палаца Незалежнасці». «Я кажу: спакойна. Я разумею, што, калі яны галоўны цэнтр улады захопліваюць, гэта ўжо сігнал усім, народу, што ўлада памянялася. Я гэта разумеў. Але я адчуваў: спакойна, не трэба спяшацца. Вось яны хадзілі-хадзілі... Але калі мы іх пужнулі каля Палаца Незалежнасці, яны зразумелі, што тут жарты скончыліся — аўтаматы ў руках. Але ж мы ні ў кога не стралялі. Вытрымка, вытрымка — да апошняга», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Падобная сітуацыя разгарнулася і падчас пандэміі, калі некаторыя кіраўнікі на ўсе галасы прапаноўвалі закрываць прадпрыемствы, арганізацыі, установы, закрывацца на лакдаўн. Але Беларусь на гэта не пайшла, абрала свой шлях. «Тое, што такіх, як мы, Беларусь, залежных і ад рэсурсаў, сыравіны, ад рынкаў, хацелі проста разваліць, разбурыць і некуды далучыць — гэта факт», — упэўнены кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што сваім рашэннем забараніў Міністэрству аховы здароўя закрываць арганізацыі і прадпрыемствы, запатрабаваўшы ў першую чаргу займацца сваім галоўным абавязкам — лячыць людзей. І тут таксама нічога б не атрымалася без цярпення. «Адзіная ў свеце краіна — мы пайшлі сваім шляхам. Мы лячылі людзей, ратавалі. Я сам хадзіў па гэтых рэанімацыях. Дзе толькі я не быў», — нагадаў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што сапраўдны корань хваробы часта хаваецца менавіта ў галаве. «Вось чым традыцыйная кітайская медыцына моцная: не сякера і скальпель, а менавіта псіхалогія, яшчэ нешта, харчаванне, паветра, вада і гэтак далей, пра што я вам казаў. А астатнія маніпуляцыі, без якіх, вядома, не абысціся — вось там урачы. Яны цуды цяпер навучыліся творыць — нашы беларускія ўрачы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Вяртаючыся да пытання аб тым, як пазбегнуць правакацый, кіраўнік дзяржавы рэзюмаваў: «Трэба ведаць прадмет і не трэба спяшацца. Не трэба спяшацца. Мая вам парада. Ніколі не спяшайцеся. Сцісніце зубы і цярпіце, глядзіце, пакуль не пераканаецеся, у сілу свайго вопыту і ведаў, правільна вы вырашылі паступіць ці не».

Паколькі размова была шчырая і адкрытая, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што самае складанае ў жыцці Прэзідэнта: «Самае складанае — гэта давер. Людзі табе вераць, давяраюць, яны за табой ідуць. Гэта самае складанае, гэта самае цяжкае. Няма нічога складанейшага за абавязак перад людзьмі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Таму, па яго словах, Прэзідэнт вымушаны пастаянна думаць аб працоўных пытаннях, паколькі ў полі зроку кіраўніка дзяржавы знаходзяцца ўсе аспекты жыцця краіны — таму ўсё навокал датычыцца яго працы.

Асабліва пытанні бяспекі, якія сёння стаяць найбольш востра. Аляксандр Лукашэнка назваў захаванне бяспекі дзяржавы адной з найважнейшых задач Прэзідэнта. Ён папярэдзіў, што парушаць граніцу Беларусі нікому не дазволена. «Вось там маленькая Беларусь... Якая яна маленькая? Гэта вялікая Беларусь, у якой жывём мы, беларускі народ. Для мяне ён вялікі, я павінен яго абараняць. Вы вялікія людзі для мяне, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Вядома, не дай бог на чырвоную кнопку націсканць, але мы краіна — мы больш не жадаем пад бізуном хадзіць, мы больш не жадаем у лапцях хадзіць. Мы дастаткова разумныя, наш народ таленавіты. І самае галоўнае — мы ж ні ў кога нічога не просім. Адчапіцеся ад нас. Вось наша зямля, мы хочам тут жыць».

Чаму рабочыя спецыяльнасці найважнейшыя

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння ва ўсіх беларусаў роўныя магчымасці. Паступленне ў ВНУ больш не ўспрымаецца як прывілея — цяпер атрымаць вышэйшую адукацыю можа кожны. Дапамагае ў гэтым і мэтавае накіраванне. Але, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, мэтавікі павінны выконваць умовы дагавора і пасля вучобы прыходзіць на працу ў арганізацыю, якая выдала мэтавае накіраванне. Ён таксама падкрэсліў, што бясплатнае навучанне — зусім не бясплатнае, за гэта плаціць дзяржаўны бюджэт. «Дзяржава рыхтуе сабе спецыялістаў і накіроўвае туды, куды дзяржаве патрэбна. Якія могуць быць скаргі на тое, што дзяржава размяркоўвае? Радавацца трэба, што ёсць першае месца працы», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён яшчэ раз падкрэсліў, што не трэба імкнуцца ў сталіцу. Камфортна жыць можна і ў рэгіёнах, тым больш што ўмовы створаны. Галоўнае — працаваць і не марнаваць час.

Тэму падрыхтоўкі маладых спецыялістаў працягнулі і самі студэнты. Яны спыталі меркаванне Прэзідэнта наконт таго, як павысіць цікавасць моладзі да інжынернай справы і зрабіць яе такой жа прэстыжнай, як IT-спецыяльнасці. Па словах кіраўніка дзяржавы, для гэтага патрэбна дастойная заработная плата і павышэнне аўтарытэту інжынераў у грамадстве. Тым больш што значнасць IT завышана — па словах беларускага лідара, «айцішнікамі» ў той ці іншай ступені сёння могуць сябе назваць многія, таму што ўся моладзь умее карыстацца гаджэтамі, камп'ютарамі. «Айцішнікі ўсе, а інжынераў мала, дэфіцыт. Адсюль і прэстыжнасць», — заўважыў ён. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што для сям'і, для штодзённага жыцця інжынерная спецыяльнасць больш важная. Бо людзі гэтай прафесіі валодаюць важнымі практычнымі ведамі і ўменнямі.

«Мы крыху адхіліліся ў гэтым плане, дысбаланс у нас. Мы будзем інжынерныя, рабочыя спецыяльнасці ўзнімаць на самы высокі ўзровень. Таму што гэта дзяржаве трэба, гэта стратэгія, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Калі мы гэтым не будзем займацца цяпер, то заўтра будзе не да гаджэтаў».

«У нас вучыцца трэба, як шанаваць сваё мінулае»

Удзельнікі мерапрыемства не пакінулі без увагі і іншыя тэмы, актуальныя для ўсёй краіны. Напрыклад, захаванне гістарычнай памяці. У Прэзідэнта спыталі, якія меры трэба прыняць, каб зрабіць гэту працу больш эфектыўнай, не дапусціць паўтарэння тых жудасных падзей і аб'яднаць народы дзеля захавання міру.

«Без лішняй сціпласці скажу: з тым, што робіць Беларусь і беларусы, ніводны народ параўнацца не можа. Па-мойму, мы ўжо зрабілі столькі, што, здаецца, і рабіць больш не трэба. На нашым прыкладзе трэба вучыцца, як быць прыхільным гэтаму, як гэта ўсё шанаваць», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што ў сярэдзіне 1990-х у Беларусі збіраліся зносіць помнікі і пераназываць вуліцы. Аднак да гэтага не дайшлі. «У нас вучыцца трэба, як шанаваць сваё мінулае. Мы павінны гэтым шляхам ісці. У нас заўсёды так бывае: а ўсё добра, ды ўсё выдатна, рукі апусцілі, ды не трэба нічога рабіць — само прыйдзе. І мы зноў або адкоцімся куды, або абрынемся. Таму не трэба гэта забываць. І я, бываючы ў Хатыні, на плошчы Перамогі, заўсёды кажу людзям: прыходзьце да помнікаў і прыводзьце сюды сваіх дзяцей», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

«Я адчуў будучыню нашай краіны»

У заключэнне Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што гэтае мерапрыемства для яго вельмі важнае. «Я вырашыў сёлета сустрэцца з прадстаўнікамі, студэнтамі нашых ВНУ, каб ім расказаць, каб у адкрытай размове яны адчулі, чым жыве краіна», — адзначыў ён. Прэзідэнт расказаў, што як чалавеку, які прымае ключавыя рашэнні па развіцці Беларусі, важна атрымаць зваротную сувязь ад прадстаўнікоў студэнцтва, даведацца, якія настроі, памкненні ў маладых людзей. «Я адчуў, чым вы жывяце. А вы — будучыня. Значыць, я адчуў будучыню нашай краіны», — падзяліўся ўражаннямі беларускі лідар.

На памяць аб гэтай важнай сустрэчы Аляксандру Лукашэнку ад усёй студэнцкай моладзі Віцебскай вобласці падарылі шахматы з масіву дуба ручной работы, якія сімвалізуюць гісторыю Прыдзвіння. Як было абяцана, яны зойміць сваё месца ў Палацы Незалежнасці. Магчыма, пасля гэтай паездкі Прэзідэнта ў Віцебск, у Палацы Незалежнасці з'явіцца яшчэ адно ноу-хау — кіраўніку дзяржавы вельмі спадабалася прадстаўленне батлейкі, якім яго сустракалі ў фае ўніверсітэта. Ён даручыў падумаць над тым, каб такім ча чынам сустракаць гасцей Палаца Незалежнасці.

Валерыя СЦЯЦКО.

Віцебск.

З нагоды

АДУКАЦЫЯ — ГЭТА БУДУЧЫНЯ НАШАЙ КРАІНЫ

Новы будынак гімназіі № 42 імя Ж. І. Алфёрава адкрыты ў Мінску

Удзел ва ўрачыстасці прынялі Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА, старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ і памочнік Прэзідэнта — інспектар па горадзе Мінску Юрый ФРАЛОЎ.

З пачатку навучальнага года прыгожы будынак, разлічаны на 1020 навучэнцаў, расчыніў дзверы па новым адрасе — вуліцы Ільянскай. У гімназіі ёсць усё неабходнае для вучобы і для пазакласных заняткаў, а таксама для паўнавартаснага развіцця творчых здольнасцяў дзяцей. Паклапаціліся і пра фізічнае развіццё школьнікаў: плавальны басейн, спартыўныя залы з сучасным абсталяваннем, цір ужо чакаюць наведвальнікаў. Уражваюць

актавая зала, камп'ютарны кабінет, кабінеты педагога-псіхолага, сацыяльнага педагога, педагога-арганізатара і кіраўніка па ваенна-патрыятычным выхаванні. Медыцынскі блок і харчаблок таксама абсталяваны па апошнім слове тэхнікі. Тэрыторыя гімназіі поўнасцю добраўпарадкавана і насычана гульнявымі спартыўнымі пляцоўкамі для заняткаў рознымі відамі спорту.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў урачыстай лінейкі звярнулася Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

— Я шчыра рада павіншаваць вас усіх з цудоўным святам — Днём ведаў. Гэта свята традыцыйна адзначаецца ў нашай краіне, і мы ўсе рыхтуемся да гэтага цудоўнага дня — бацькі, педагогі, будаўнікі. А вас віншую яшчэ з адным святам: гімназія № 2 імя Жарэса Алфёрава набыла новы будынак — прыгожы, утульны, камфартабельны — для вучобы нашых дзяцей і работы педагогаў. Сёння вы адкрываеце новую старонку ў гісторыі вашай гімназіі. Гэты год для нас асабліва — 80-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 30-годдзе ўстанаўлення інстытута прэзідэнцтва ў нашай краіне. Сістэма адукацыі — прыярытэтны кірунак у сацыяльнай палітыцы нашай дзяржавы, таму што мы разумеем, што гэта — будучыня нашай краіны, — сказала Наталля Качанава. — Хачу павіншаваць нашых першаклашак. Наколькі для іх гэта хвалюючы дзень! Дарагія хлопчыкі і дзяўчынкі, вучыцеся добра, а самае галоўнае — сябруйце, любіце сваіх настаўнікаў і не засмучайце бацькоў. Мы шчыра жадаем, каб гэтая гімназія стала для вас добрым домам. Шчыра віншую старшакласнікаў — тых, хто ўжо ў гэтым годзе будзе выбіраць свой прафесійны шлях. Я шчыра віншую педагогаў, настаўнікаў, выхавальнікаў — усіх тых, хто будзе працаваць і працуе ў такой няпростай сферы — сістэме адукацыі, але такой патрэбнай нашай краіне.

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, да Дня ведаў рыхтуюцца не толькі педагогі, бацькі і школьнікі, але і дзяржаўныя і мясцовыя органы ўлады.

— Прыводзяцца ў парадак дзіцячыя дашкольныя ўстановы, школы, адкрываюцца новыя. Новы будынак для гімназіі — падарунак для такога маладога мікрараёна сталіцы. Гэта гімназія не новая, у яе ўжо ёсць свая слаўная гісторыя, але памяшканне было параўнальна невялікім, а сёння яны пераехалі ў новы будынак, у якім ёсць усе ўмовы для навучання і выхавання, — адзначыла спікер і падкрэсліла, што дзеці — гэта наша будучыня.

— Ад таго, якія яны атрымліваюць веды, як выхоўваюцца ў сценах гімназій і школ, залежыць будучыня нашай краіны. Аб гэтым неаднаразова гаварыў наш Прэзідэнт, у тым ліку ў час Рэспубліканскага педагагічнага савета ў гэтым годзе. Адукацыя — адзін з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. Таму ў Беларусі робіцца ўсё для таго, каб дзеці маглі вучыцца, атрымліваць веды, а ў далейшым — рэалізаваць свае здольнасці на карысць Радзімы. Не ў кожнай краіне святкуюць 1 верасня, калі дзеці першы раз прыходзяць у школу, садзяцца за парты, каб атрымліваць веды, — дадала Старшыня Савета Рэспублікі.

У сваю чаргу Уладзімір Кухараў зазначыў, што ў гімназіі створаны ўсе ўмовы для таго, каб атрымліваць якасную адукацыю. Каб кожны атрымаў па сваіх жаданнях і здольнасцях усё неабходнае, што датычыцца навучальных прадметаў, выхаваўчай работы, спартыўных захапленняў і гэтак далей. Ён таксама выказаў спадзяванне, што гімназія стане навуковым і спартыўным цэнтрам для ўсяго мікрараёна, а таксама падорыць нашай краіне вельмі шмат выдатных вучоных.

Як адзначыла дырэктар гімназіі Віктарыя Коржык, прыярытэтны кірунак работы ўстановы адукацыі — стварэнне шматфункцыянальнага адукацыйнага асяроддзя, якое забяспечвае атрыманне якаснай агульнай сярэдняй адукацыі кожным навучэнцам з улікам яго індывідуальных асаблівасцяў і патрэб. Яна падкрэсліла, што гімназія цудоўна аснашчана, тут выдатны педагагічны калектыў, у тым ліку і маладыя спецыялісты, а бацькі заўсёды гатовы да супрацоўніцтва. Усё гэта будзе спрыяць далейшаму напаўненню адукацыйнай прасторы і развіццю ўстановы адукацыі.

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.
Фота БелТА.

Сплаў маладосці і вопыту

У віцебскім мікрараёне «Білева» ў Дзень ведаў расчыніла свае дзверы ўнікальная ўстанова адукацыі — пачатковая школа № 48. Аналагаў ёй пакуль няма ў нашай краіне. Са святам навучэнцаў, іх бацькоў і педагогаў першымі павіншавалі ганаровыя госці.

З добрымі словамі і каштоўнымі падарункамі на лінейку да маленькіх віцябчан завітаі **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар СЕРГЯЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ, старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН,** прадстаўнікі абласной і гарадской улады.

Шматфункцыянальны аб'ект разлічаны на адначасовае навучанне 850 дзяцей, 560 з іх — гэта выхаванцы дзіцячага садка, 290 — навучэнцы пачатковай школы. Установа падзелена на тры блокі, якія злучаны паміж сабой. У кожнага — свая колеравая гама. Акрамя 31 групы для дзяцей ва ўзросце ад аднаго да шасці гадоў, асобна абсталявана памяшканне для групы кароткачасовага знаходжання.

Для навучэнцаў пачатковай школы абсталявалі 16 класаў з апошняй сучаснай тэхнікай. Ва ўстанове маюцца тры спартыўныя залы, у адной ёсць нават інтэрактыўны скаладром, басейн, дзве трэнажорныя залы, два музычныя класы, актавая зала на 100 месцаў, клас харэаграфіі і інш. У пакоі псіхалагічнай разгрузкі дзецям прапануюць адпачыць за інтэрактыўным сталом і пагуляць на такой жа падлозе, запрашаюць у майстэрню анімацыі. У школе ёсць робататэхнічны набор рэльефных прадметаў для магнітнай дошкі па развіцці матэматычных здольнасцяў. Расклад заняткаў публікуецца на сэнсарнай панэлі. Важна, што ў 48-й школе падчас будаўніцтва вялікую ўвагу надалі стварэнню безбар'ернага асяроддзя для дзяцей з асаблівасцямі здароўя: тут ёсць пандусы, ліфты для школьнікаў-інвалідаў, шрыфт Брайля.

Па задумцы такая ўнікальная ўстанова павінна дапамагчы дашкольнікам не толькі адаптавацца ў сацыуме, але і плаўна перайсці ад садка да пачатковай школы ў знаёмай цёплай атмасферы. А ў гэтым маладому пакаленню, безумоўна, дапамогуць вопытныя педагогі, здольныя павесці за сабой у краіну ведаў. Дарэчы, педагагічны калектыў новай установы налічвае больш за 100 чалавек, 40 з іх — маладыя спецыялісты.

«У Віцебску запускаецца ўнікальны эксперыментальны праект. Тут гарманічна спалучаецца дашкольная і пачатковая школьная адукацыя. Упэўнены, што гэты праект стане цэнтрам сучаснага ведаў, патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання юных жыхароў Віцебска. Асноўвай, душой школы, вядома, з'яўляецца педагагічны калектыў. Таму мой наказ дырэктару школы — сфарміраваць працаздольны калектыў, у якім спалучаецца вопыт старэйшых педагогаў і запал маладых пачынаючых выпускнікоў віцебскіх і іншых беларускіх ВНУ. Бацькоў заклікаю вучыцца разам з дзецьмі, працаваць разам з педагогамі. Толькі разам мы зможам навучыць дзяцей таму, што неабходна ў жыцці, выхаваць сапраўдных патрыётаў нашай краіны. Звяртаючыся да юных, самых галоўных удзельнікаў сённяшняга мерапрыемства, хацеў бы адзначыць: смела асвойвайце гэты будынак, але беражыце гэтыя сцены і ўсё, што створана працай вашых бацькоў», — звярнуўся да ўдзельнікаў свята старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка. Ад імя дэпутатаў ён уручыў дырэктару школы інтэрактыўную панэль.

Сертыфікат на суму 15 тысяч рублёў для папаўнення матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстанове адукацыі ўручыў і кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Дзмітрый Крутой. Ён адзначыў, што ў канцэпцыю школы было закладзена шмат сэнсаў. Галоўны — адаптацыйны пераход дзетак з садка ў школу. «Важны момант — гэта эканомія рэсурсаў. Забяспечыць самую высокую якасць, самыя сучасныя тэхналогіі, якія сёння толькі ёсць у нашай краіне, але пры гэтым сэканоміць на стадыі праектавання і будаўніцтва, на стадыі ўтрымання будынка. Гэтая эканомія на адміністрацыі, на нейкіх гаспадарчых функцыях. І трэці важны момант — педагогі. Важна паглядзець на замацаванне, у Віцебскай вобласці яно адно з самых высокіх. Прыкладна 70 % педагогаў, якія пачынаюць працаваць у школах, застаюцца ў гэтых установах адукацыі. Таму цікава будзе паглядзець, наколькі маладыя спецыялісты ўвальюцца ў калектыў», — падзяліўся Дзмітрый Крутой.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін падзякаваў усім, хто прымаў удзел у будаўніцтве пачатковай школы: з этапу праектавання да добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі. «Вам, дзеці, жадаю цярпення, з вялікай цікавасцю асвойваць усё тое новае, што вас чакае ў гэтых сценах. Педагогам — удзячных вучняў і таксама берагчы тое, што мы разам стварылі», — пажадаў Аляксандр Субоцін і уручыў дырэктару школы сертыфікат і спартыўны інвентар.

Сімвалічны ключ ад новага карабля ведаў Віцебшчыны кіраўніку ўстановы адукацыі Ілоне Марчанка ўручыў генеральны дырэктар ААТ «Жылбуд» Аляксандр Літвінаў. Пасля ўрачыстага перарэзвання чырвонай стужкі першымі ў новыя класы зайшлі першакласнікі са сваімі першымі настаўнікамі. Ігар Сергяенка, Дзмітрый Крутой і Аляксандр Субоцін асабіста павіншавалі 1 «А» з новым навучальным годам і ўручылі дзецям кнігі «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку», а таксама азнаёміліся з матэрыяльна-тэхнічнай базай школы.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

❍ Прыёмы грамадзян

10 верасня 2024 г. члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян у Гродзенскай вобласці.

У гэты дзень парламентарыі наведаюць усе раёны рэгіёна, сустрэнуцца з жыхарамі, выслухаюць просьбы, прапановы і скаргі, па магчымасці акажуць садзейнічанне ў вырашэнні хвалюючых пытанняў.

Традыцыйна людзей чакаюць у выканкамах:

• Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Качанава Наталля ІВАНАЎНА — з 11.00 у Іўеўскім райвыканкаме (г. Іўе, пл. Камсамольская, 1; тэлефоны для запісу: 8 017 328 53 24, 8 017 323 93 33);

• старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ЗАЯЦ Леанід Канстанцінавіч — з 11.00 у Навагрудскім райвыканкаме (г. Навагрудак, вул. Міцкевіча, 11; тэл. для запісу: 8 0159 74 26 39);

• старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці СІВЕЦ Сяргей Міхайлавіч — з 11.00 у Мастоўскім райвыканкаме (г. Масты, плошча Леніна, 3; тэл. для запісу: 8 0151 56 13 04);

• старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах ТАТАРЫНОВІЧ Уладзіслаў Вікенцьевіч — з 11.00 у Дзятлаўскім райвыканкаме (г. Дзятлава, вул. Леніна, 18; тэл. для запісу: 8 0156 36 12 51, 8 017 327 25 27);

• намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах БАЙКО Валянцін Валянцінавіч — з 10.00 да 12.00 у Бераставіцкім (г. п. Вялікая Бераставіца, пл. Ратушная, 1; тэл. для запісу: 8 0151 17 58 37) і з 13.00 да 15.00 у Свіслацкім (г. Свіслач, пл. К. Маркса, 4; тэл. для запісу: 8 0151 37 71 73) райвыканкамах;

• член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве ЖАМОЙДА Андрэй Пятровіч — з 10.00 да 12.00 у Воранаўскім (г. п. Воранава, вул. Савецкая, 34; тэл. для запісу: 8 0159 42 22 55, 8 0159 42 12 73) і з 14.00 да 16.00 у Лідскім (г. Ліда, вул. Савецкая, 8; тэл. для запісу 8 0154 53 40 30) райвыканкамах;

• член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці ЖУК Ігар Георгіевіч — з 10.00 да 12.00 у Астравецкім (г. Астравец, вул. К. Маркса, 2; тэл. для запісу 8 0159 12 86 10) і з 13.00 да 15.00 у Смаргонскім (г. Смаргонь, вул. Леніна, 5; тэл. для запісу 8 0159 23 76 57) райвыканкамах;

• член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ЗАХАРЧУК Дзмітрый Іванавіч — з 11.00 да 13.00 у Ашмянскім райвыканкаме (г. Ашмяны, вул. Савецкая, 103; тэл. для запісу 8 0159 32 21 32);

• член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ІВАНОЎ Алег Вітальевіч — з 10.00 да 13.00 у Шчучынскім райвыканкаме (г. Шчучын, пл. Свабоды, 11; тэл. для запісу: 8 0151 42 01 96, 8 0151 42 15 38);

• член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах АШУРЫК Павел Станіслававіч — з 11.00 да 13.00 у Зэльвенскім (г. п. Зэльва, вул. 17 Верасня, 29; тэл. для запісу: 8 0156 47 29 14, 8 0156 43 29 63) і з 14.00 да 16.00 у Слонімскім (г. Слонім, вул. Чырвонаармейская, 40; тэл. для запісу 8 0156 22 71 77) райвыканкамах;

• член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах СТАЛЬБОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна — з 11.00 у Ваўкавыскім райвыканкаме (г. Ваўкавыск, вул. Дзяржынскага, 3; тэл. для запісу 8 0151 25 13 19);

• член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці ЯНУШКА Андрэй Вячаслававіч — з 10.00 у адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Гродна (г. Гродна, вул. Гагарына, 18/2; тэл. для запісу 8 0152 49 06 91.

• 9 верасня 2024 г. з 11.00 да 14.00 **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ХАМЕНКА Сяргей Мікалаевіч** правядзе прыём грамадзян у Карэліцкім райвыканкаме (г. п. Карэлічы, пл. 17 Верасня, 9; тэлефон для запісу 8 0159 62 12 55).

Папярэдні запіс ажыццяўляецца з 1 і 5 верасня з 11.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00.

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ

Адкрыты новы комплекс будынкаў Мінскага мастацкага каледжа

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ўрачыста адкрыў новы комплекс будынкаў з інтэрнатам Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава, паведаміла БелТА.

Фота БелТА.

У час урачыстай лінейкі Раман Галоўчанка павіншаваў навучэнцаў з пачаткам новага навучальнага года: «Разам з вамі гэтае свята па ўсёй краіне адзначаюць амаль два мільёны школьнікаў і студэнтаў. Ну і, вядома, першакласнікі, якія ўпершыню сёлета сядуць за парты. Іх у нас 105 тысяч. Першакурснікаў таксама шмат. У каледжы і ВНУ ўпершыню прыйшлі больш як 100 тысяч навучэнцаў».

Перад навучэнцамі каледжа расчыніў свае дзверы новы будынак. «Прасторнае памяшканне напоўніцца вашымі галасамі, вашымі ўсмешкамі, ну і, вядома ж, той атмасферай творчасці і натхнення, якую вы самі для сябе і ствараеце», — упэўнены прэм'ер. Дзяржава сапраўды нямала робіць для сферы адукацыі, заўважыў Раман Галоўчанка. «Толькі за апошнія некалькі гадоў пабудавана больш за 60 новых школ і дзіцячых садоў. Сваю работу пачалі яшчэ пяць школ і тры дзіцячыя садкі на 5,5 тысячы месцаў. Адкрываецца новы інтэрнат Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізкультуры. Да канца года новы інтэрнат атрымае і БНТУ. Ну і цудоўны падарунак атрымлівае сфера культуры — мы адкрываем цэлы комплекс будынкаў з інтэрнатам Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя Глебава. Пабудаваны ён на тым самым месцы, дзе знаходзіўся з 1947 года. Значыць, слаўная гісторыя каледжа будзе прадоўжана», — з упэўненасцю адзначыў кіраўнік урада.

На будаўніцтва комплексу затрачана звыш Br37 млн бюджэтных сродкаў. Па словах прэм'ера, гэта быў няпросты праект са складанай гісторыяй. «Тым не менш мы адшукалі магчымасць і аператыўна завяршылі гэты найважнейшы для нашай культуры аб'ект. Таму што, інвестуючы сюды, інвестуючы ў культуру, адукацыю, мы, вядома ж, інвестуем і ў будучыню нашай краіны. Гэта вельмі важна», — падкрэсліў прэм'ер.

У будынку светлыя аўдыторыі, майстэрні з сучасным абсталяваннем, спартыўная, актавая залы і ўтульны інтэрнат. «Спадзяюся, што ўсё гэта вас яшчэ дадаткова прастымулюе да дасягнення высокіх вынікаў у вучобе. Ваш каледж — гэта адна са знакавых для нашай краіны навучальных устаноў. У яго сценах навучаліся многія з тых людзей, якія сваёй творчасцю праславілі Беларусь. Спадзяюся, што вы працягнеце гэтыя слаўныя традыцыі. Не бойцеся ставіць перад сабой амбіцыйныя мэты. Вас ніхто не будзе абмяжоўваць у вашых творчых пошуках, творчасці. Будзьце верныя сабе і свайму пакліканню. Для вас адкрыты свет, і дзякуючы сваім талентам вы зможаце яго заваяваць. Я ў гэта вельмі веру», — даў наказ Раман Галоўчанка.

Прэм'ер-міністр уручыў кіраўніцтву каледжа сертыфікат на камфартабельны мікрааўтобус МАЗ 281040. Акрамя таго, кіраўнік урада асабіста азнаёміўся з інтэр'ерам новых будынкаў і іх функцыяналам. Так, у навучальным корпусе размешчаны аўдыторыі і майстэрні, кабінеты для выкладчыкаў, харчаблок, гардэробная, спартыўная і актавая залы. У спартыўнай зале навучэнцы і выкладчыкі змогуць гуляць у валейбол, гандбол, баскетбол. Знойдзецца месца і для настольнага тэніса. Актавая зала разлічана на 120—130 месцаў.

❍ У тэму

Для мадэрнізацыі будынка Акадэміі музыкі будзе выдзелена больш як Br4 млн. Аб гэтым расказаў **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ** перад адкрыццём новага комплексу будынкаў з інтэрнатам Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава.

Міністр адзначыў, што выпускнікі мастацкага каледжа запатрабаваны не толькі ўнутры краіны. На іх з прыцэлам глядзяць і замежныя партнёры. «Гэта сведчыць аб высокай якасці сістэмы адукацыі ў сферы культуры, таму што чалавек творчы заўсёды нясе ў сабе пазітыў, выдатны настрой і робіць так, каб наша цудоўная краіна была яшчэ прыгажэйшай», — упэўнены Анатоль Маркевіч.

Адкрыццё будынкаў каледжа — яскравы прыклад адносін дзяржавы да сферы культуры, такіх прыкладаў вельмі шмат па Беларусі, адзначыў Анатоль Маркевіч. «Сёлета абноўлены школы мастацтваў, праведзены капітальныя рамонты сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Нашы вышэйшыя навучальныя ўстановы таксама набылі асаблівы змест, — падкрэсліў міністр. — Акадэмія музыкі — флагман сферы адукацыі ў культуры — таксама будзе капітальна адрамантавана. Мы бачым, што такія ўмовы стымулююць вучняў да дасягнення добрых вынікаў».

Каб памяталі

НЕПЕРАМОЖАНЫ

Учора не стала чалавека-легенды. Памёр Аляксандр Мядзведзь, ён пайшоў ад нас на 87-м годзе жыцця.

...26 жніўня 1972 года. Федэратыўная Рэспубліка Германія, Мюнхен. Olympiastadion: 52 гады назад тут адбылося ўрачыстае адкрыццё гульняў XX Алімпіяды. Сабралася рэкордная колькасць удзельнікаў і нацыянальных каманд. Адно з самых унушальных прадстаўніцтваў — у Савецкага Саюза — 373 атлеты. На чале калоны савецкіх спарсменаў ішоў беларускі барэц вольнага стылю, двухразовы (на той момант) алімпійскі чэмпіён Аляксандр Мядзведзь, ён нёс сцяг дзяржавы.

Шлях да трэцяга залатога медаля быў у яго непросты. Чаго вартая, напрыклад, перамога над 200-кілаграмовым амерыканцам Крысам Тэйларам (сам Мядзведзь тады важыў «усяго» 107 кг). У фінальным паядынку яму супрацьстаяў балгарын Асман Дураліеў. «Асман мне кажа, маўляў, Сашок, я сыходжу, дай мне выйграць». А я адказваю: «Асман, я ж таксама сыходжу», — успамінаў той мамант Аляксандр Васільевіч. Да апошняга імгнення Мядзведзь застаўся верны сабе і атрымаў перамогу. Пасля таго, як суддзя ўзняў яго руку, Мядзведзь пакланіўся гледачам, стаў на калені і пацалаваў барцоўскі дыван, з якога сышоў непераможаным.

Вядома, шкада было расставацца. Да слёз. Аляксандр Мядзведзь ведаў, што гэта апошняя Алімпіяда. Як бывае ў спартсменаў: трэніруешся да сёмага поту, змагаешся, усяго сябе аддаеш (інакш нельга), а потым быццам усё страціў... Тут галоўнае — знайсці сабе справу і ісці далей. Інакш можаш зламацца. Бо спартсмены на працягу многіх гадоў жывуць толькі спаборніцтвамі і перамогамі. Пасля Мядзведзю прапаноўвалі пераехаць у Амерыку. Але Аляксандр Васільевіч застаўся тут, у Беларусі, у Мінску. Тут сфарміраваўся як асоба. Атрымаў усё: вышэйшую адукацыю, Дзяржаўную прэмію, прафесарскае званне. Быў прызнаны найлепшым беларускім спартсменам XX стагоддзя.

Аляксандр Васільевіч шмат і плённа працаваў у якасці трэнера зборнай каманды БССР і СССР. Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле беларускія барцы вольнага стылю дабіліся высокіх спартыўных вынікаў: станавіліся чэмпіёнамі СССР, пераможцамі Кубкаў свету сярод дарослых, чэмпіёнамі Еўропы, чэмпіёнамі свету... У ліку чэмпіёнаў і сын Мядзведзя, Аляксей.

Аляксандр Мядзведзь — жывы прыклад таго, як праца, самаахвярнасць і імкненне да дасканаласці могуць прывесці да самых высокіх вынікаў. Гісторыя найлепшага барца вольнага стылю свету натхняе многія тысячы людзей змагацца за свае мары і не адступаць перад цяжкасцямі.

«Не зайздросці, не раскісай, не шукай прычын сваіх няўдач на баку» — запаведзь Аляксандра Мядзведзя.

Будзем памятаць пра гэта.

Бывайце, Аляксандр Васільевіч...

Звяздоўцы.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным і блізкім заслужанага майстра спорту СССР, заслужанага трэнера БССР і СССР, шматразовага чэмпіёна свету і Алімпійскіх гульняў Аляксандра МЯДЗВЕДЗЯ.

«Прыміце шчырыя спачуванні ў сувязі са смерцю легенды сусветнага спорту Аляксандра Васільевіча Мядзведзя. Пайшоў з жыцця вялікі атлет, трэнер, грамадскі дзеяч у гісторыі спорту», — гаворыцца ў спачуванні.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Аляксандр Мядзведзь усяго сябе прысвяціў служэнню роднай Беларусі, зрабіў неацэнны ўнёсак у развіццё нацыянальнай школы барацьбы і алімпійскага руху.

«У памяці беларускага народа Аляксандр Васільевіч назаўжды застанецца як увасабленне сілы, мудрасці і патрыятызму», — падкрэсліў беларускі лідар.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю МЯДЗВЕДЗЯ Аляксандра Васільевіча, заслужанага майстра спорту СССР, заслужанага трэнера БССР і СССР, шматразовага чэмпіёна свету і Алімпійскіх гульняў, выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Падзяляем цалкам горыч гэтай незаменнай страты.

Светлая памяць пра Аляксандра Васільевіча назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Блізкая ўлада

КАЛІ ЎДАЛОСЯ ДАПАМАГЧЫ ХОЦЬ БЫ АДНАМУ ЧАЛАВЕКУ, ЗНАЧЫЦЬ, ПРЫЁМ ПРАЙШОЎ НЕДАРЭМНА

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН правёў асабісты прыём грамадзян. Дапамога бізнесу, землеўладкаванне, капітальны рамонт — з гэтымі і іншымі пытаннямі да кіраўніка вобласці звярталіся людзі з Віцебска і Полацка.

Палачанін звярнуўся на прыём па пытанні няспраўнага дамафона ў сваім доме. Ён распавёў, што шукаў абслуговую арганізацыю і за змену няспраўнага дамафона пасля доўгіх хаджэнняў па інстанцыях вырашыў заплаціць самастойна са сваёй кішэні немаленькую суму. Старшыні аблвыканкама і заяўніку прадстаўнік Полацкага райвыканкама распавёў, што неўзабаве пытанне будзе вырашана і з абслуговай арганізацыяй на месцы, гэтым зоймецца адзін з буйных аператараў у краіне, які аказвае паслугі дамафоннай сувязі.

Звярнулася да Аляксандра Субоціна і віцебская сям'я, якая ўжо тры дзесяцігоддзі мае прадпрыемства па вытворчасці мэблі з масіву. Але невялікі бізнес знаходзіцца пад пагрозай закрыцця, бо тэрыторыя, дзе размешчаны цэхі, па генплану забудовы горада будзе аддадзена пад жыллёвае будаўніцтва. Першапачаткова прадпрымальнікі прасілі, каб паркоўку аднаго з жылых дамоў, якая павінна будзе тут з'явіцца, перанеслі ў іншае месца, але цяпер, калі іх рабочыя амаль усе звольніліся з прадпрыемства ў сувязі з закрыццём, сужэнцы змірыліся са стратай цэха і прыбыткавай справы. На прыёме грамадзян яны расказалі кіраўніку рэгіёна, што гатовы аддаць добраўпарадкаваны ўчастак для патрэб горада, але просяць выплату абяцанай кампенсацыі. Аляксандр Субоцін даручыў заняцца гэтым пытаннем і падкрэсліў, што ў такім выпадку ў новым жылым мікрараёне якраз было б пажадана пакінуць перспектыўнае прадпрыемства, каб мясцовым жыхарам было дзе працаваць.

Жыхары садовых таварыстваў нярэдка сутыкаюцца з праблемамі ў камунікацыі з суседзямі і мясцовай уладай, якія прыводзяць да больш значных праблем. Кіраўнік садовага таварыства адмаўляе жанчыне пенсіённага ўзросту ўзгадняць заяўленыя межы ўчастка, якія на некалькі сантыметраў больш за дакументальныя, а без гэтага дазволу ўладальніца не можа зарэгістраваць яго ў адпаведнай службе. Заяўніцы прапанавалі звярнуцца ў праўленне таварыства, пасля наведаць агульны сход для абскарджання ў выпадку адмовы, а затым звярнуцца ў суд. Таксама заяўніца засяродзіла ўвагу на стане шматкватэрнага дома на вуліцы Смаленскай. Паводле яе слоў, толькі пасля зваротаў у розныя інстанцыі кватэру і балкон прывялі ў адпаведнасць з тэхнічнымі патрабаваннямі. Старшыня аблвыканкама ўзяў абодва пытанні на кантроль і даў даручэнне спецыялістам разабрацца ў кожнай сітуацыі.

Пытанне па афармленні сажалкі ў іншым садовым таварыстве патрабуе змен у заканадаўстве. На зямельным участку заяўніцы знаходзіцца самаробны вадаём. На неадпаведнасць яго памераў нарматывам скардзяцца суседзі, а жанчына цяпер не можа прадаць дачу. Спецыялісты абласных камітэтаў па архітэктуры і будаўніцтве і прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя адзначылі, што ў рэгіёне падобныя выпадкі нярэдкія, і таму яны выйшлі з прапановай унесці ў заканадаўства змены, па якіх вадаёмы пэўнай плошчы не будуць падлягаць абавязковай рэгістрацыі. Гэтае пытанне знаходзіцца на разглядзе ва ўрадзе, а да ўнясення дапаўненняў і змяненняў у існуючы заканадаўчы акт уладальнікі дачы не змогуць яе прадаць. Аляксандр Субоцін даручыў спецыялістам БТІ вывучыць пытанне і прапанаваць рашэнне, калі яно маецца, абапіраючыся на існуючы закон, каб не чакаць прыняцця абноўленага.

Падводзячы вынікі работы, кіраўнік вобласці падкрэсліў, што прыёмы грамадзян — гэта досыць эфектыўны механізм узаемадзеяння з насельніцтвам. «З дапамогай прыёмаў выяўляюцца праўныя праблемы, прабелы ў заканадаўстве, і мы бачым, дзе сістэма дае збой. Часам ініцыятывы, з якімі прыходзяць грамадзяне, дапамагаюць палепшыць заканадаўчую базу і павысіць эфектыўнасць работы ўсёй сістэмы. Але існуе і адваротны бок медаля: некаторыя грамадзяне прыходзяць на прыём дзясяткі разоў з адным і тым жа пытаннем. Мы тлумачым ім алгарытм дзеяння, але яны не заўсёды гатовы слухаць і выкарыстоўваюць прыём як спосаб выказацца. Знайсці баланс паміж карысцю і ўтрыманствам — задача няпростая. Аднак, калі хоць бы аднаму чалавеку ўдаецца дапамагчы ў вырашэнні такіх прыёмаў, то гэта ўжо недарэмна», — заключыў Аляксандр Субоцін.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота «Витебские вести».

Прапановы

І ПАРТНЁРЫ, І СЯБРЫ, І АДНАДУМЦЫ

Напрыканцы жніўня Віцебшчына прэзентавала свой эканамічны, культурны і гістарычны патэнцыял у расійскім горадзе Пскове. Вядучыя прадпрыемствы і арганізацыі паўночнага рэгіёна прадставілі распрацоўкі і ўзоры імпартазамяшчальнай прадукцыі, а патэнцыяльных і рэальных расійскіх партнёраў азнаёмілі з інвестыцыйнымі прапановамі. Вынікам Дзён Віцебскай вобласці ў Пскове стаў важкі пакет падпісаных кантрактаў і пагадненняў.

У Фінскім парку свае пляцоўкі прадставілі больш за два дзясяткі прадпрыемстваў паўночнага рэгіёна. Прадукцыю і тэматычныя выставы прэзентавалі «Віцебскдрэў», «Полацк-Шкловалакно», «Белвест», «Віцебскаблгаз», Свабодная эканамічная зона «Віцебск», Аршанскі льнокамбінат, «Віцебскія дываны», «Віцязь», «Нафтан». Сярод экспанатаў — інавацыйнае падлогавае ламінаванае пакрыццё на аснове ДВП высокай шчыльнасці, якое распрацавана ААТ «Віцебскдрэў». З нечаканага боку жыхары і госці Пскова ўбачылі віцебскіх газавікоў, якія прадставілі на выставе экалагічна чысты корм новага пакалення, што выпускае завод па вытворчасці экструдаванага збожжа, адкрыты ў сельскагаспадарчым філіяле «Мазалавагаз». Паглыбленне ў аграрную тэму газавікі пацвердзілі і дэманстрацыяй пашыранай лінейкі тарфяных грунтоў, якія карыстаюцца попытам на ўнутраным і знешнім рынках. Не абышлося і без флагманаў харчовай прамысловасці: па віцебскія адмысловыя каўбасы і сыры выстраіліся вялікія чэргі з расійскіх гасцей.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін сустрэўся з губернатарам Пскоўскай вобласці Міхаілам Вядзернікавым. Па выніках сустрэчы бакі падпісалі пратакол па Пагадненні паміж Урадам Пскоўскай вобласці і Віцебскім абласным выканаўчым камітэтам аб супрацоўніцтве ў эканамічнай, навукова-тэхнічнай, культурнай і гуманітарнай галінах ад 17 верасня 2015 аб зацвярджэнні Плана мерапрыемстваў на 2024—2026 гады і сам план. Міхаіл Вядзернікаў падкрэсліў, што Беларусь сёння застаецца адным з ключавых і самым надзейным расійскім партнёрам. «Па большасці пазіцый гандлю ў нас дынаміка станоўчая. Дзейнічаюць пагадненні аб супрацоўніцтве на ўзроўні рэгіёнаў, на муніцыпальным узроўні, а таксама ў сферы адукацыі. Пскоўская вобласць актыўна купляе беларускую тэхніку. Мы задаволены і цэнавай палітыкай прадпрыемстваў, і якасцю прадукцыі. Закупляем і аўтобусы, і сельгастэхніку. Частка смецця возаў працуе на платформе МАЗа. Беларускія машыны можна сустрэць у кожным кутку Пскоўскай вобласці. Да работы на Пскоўшчыне прыцягваюць беларускіх праекціроўшчыкаў, у нас ужо ёсць першы вопыт, ён станоўчы. Тэма доўгатэрміновая, аб'ектаў у нас шмат, плюс новыя праекты», — зазначыў губернатар Пскоўскай вобласці.

Кантракт на пастаўку абутковай прадукцыі на 50 мільёнаў расійскіх рублёў заключыла прадпрыемства «Белвест» з ЗАТ «Белвест Рытэйл Масква», а ўвогуле Беларусь падпісала з расійскімі партнёрамі кантракты на суму звыш 1,7 мільярда расійскіх рублёў.

Вялікая работа падчас Дзён Віцебскай вобласці ў Пскове была праведзена ў сферы аховы здароўя. Так, адбылася Міжнародная навукова-практычная медыцынская канферэнцыя, якая прайшла з удзелам высокакваліфікаваных спецыялістаў вядучых устаноў аховы здароўя Пскоўскай і Віцебскай абласцей. Нашы медыкі ўпершыню ў рамках такога фармату сумесна з расійскімі калегамі правялі серыю аперацый, падзяліўшыся вопытам і напрацоўкамі.

Мемарандум аб узаемаразуменні заключылі ўпраўленне спорту і турызму Віцебскага аблвыканкама і Камітэт па спорце Пскоўскай вобласці. Два ведамствы рыхтуюць праект «Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны прыгранічных малых паселішчаў Віцебскай і Пскоўскай абласцей як элемента ўніфікацыі, гарманізацыі і збліжэння брацкіх народаў». Галоўная мэта гэтага праекта — пашырыць супрацоўніцтва сумежных тэрыторый у розных напрамках.

Супрацоўнікаў віцебскіх і пскоўскіх бібліятэк аб'яднаў міжнародны круглы стол «80-годдзю Перамогі прысвячаецца». Вынікам сустрэчы стала падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве. Прадстаўнікі Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама ў рамках дзён рыхтуюцца падпісаць пяць пагадненняў аб супрацоўніцтве з дзяржаўнымі сацыяльнымі пансіянатамі. Дэлегацыя ўзяла ўдзел у круглым стале па пытаннях садзейнічання занятасці насельніцтва, прыцягнення замежнай рабочай сілы, працаўладкавання дзяцей і моладзі, аплаты працы і сацыяльнага партнёрства, аховы працы, сацыяльнай абароны і сацыяльнага абслугоўвання пажылых грамадзян, інвалідаў. Віцябчане наведалі тры ўстановы сацыяльнага абслугоўвання Пскоўскай вобласці.

Яркім фінальным акордам чатырохдзённага мерапрыемства стаў гала-канцэрт «З любоўю з Віцебска». Музычныя падарункі расійскім сябрам дарылі найлепшыя творчыя калектывы Віцебшчыны: актэт балалаек «Віцебскія віртуозы», ансамбль танца музыкі і песні «Талака», сімфанічны аркестр Віцебскай абласной філармоніі. Падзея стала сапраўдным святам, атмасфера народнага адзінства ўзбагацілася сілай мастацтва і сардэчным водгукам публікі.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота «Витебские вести».

З нагоды

«У САЛІГОРСКА ВЫДАТНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ»

Тут адкрылі новую сучасную школу

Павіншаваць дзяцей з пачаткам вучобы і адкрыць новую сучасную школу ў Салігорску прыехаў старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН. Карэспандэнт «Звязды» даведаўся, чым парадуе сваіх вучняў унікальная школа.

«Калі адкрываюцца ўстановы адукацыі, значыць, горад развіваецца. Мяркуючы па колькасці дзяцей, якія ідуць у першы клас, можна сказаць, што ў Салігорска выдатныя перспектывы. Гэтая школа па-свойму ўнікальная, таму што ўпершыню ўзведзена з канструкцый Салігорскага домабудаўнічага камбіната. Таму я думаю, што ўжо ў найбліжэйшы час у Мінскай вобласці будуць узводзіцца такія школы», — адзначыў старшыня аблвыканкама.

Праект школы сапраўды індывідуальны. Гэта каркасная канструкцыя з энергаэфектыўных сценавых трохслаёвых вонкавых панэляў, якія дазваляюць паскорыць мантаж. Такая тэхналогія таксама дазваляе эфектыўна выкарыстоўваць плошчу.

Ён адзначыў багатае насычэнне школы абсталяваннем, у тым ліку спартыўным і для правядзення ўрокаў працоўнага навучання, што важна для прафарыентацыі падрастаючага пакалення. Сёння вельмі важная прафесійная арыентацыя: «Педагог на месцы бачыць, у чым будучы выпускнік моцны. Можна ж узяць мэтавае накіраванне на прадпрыемстве і паступіць у каледж ці ўніверсітэт. Трэба працаваць і з патэнцыяльнымі работадаўцамі».

У сістэму адукацыі Мінскай вобласці ўкладваюцца немалыя сродкі. І гэта не толькі будаўніцтва, але і рамонт дзеючых аб'ектаў. Школа, збудаваная ў Салігорску, абышлася для бюджэту ў 48 мільёнаў рублёў. «Сотні мільёнаў укладваем у рамонт, у набыццё транспартных сродкаў, у будаўніцтва жылля. Напярэдадні свята адкрылі новы арэнды дом для педагогаў. І будзем далей працягваць рухацца ў гэтым кірунку, — падкрэсліў Аляксандр Турчын. — Прыемна прымаць такія рашэнні і бачыць вынік».

Школу № 15 у Салігорску пачалі ўзводзіць у сакавіку мінулага года. Праектная магутнасць установы адукацыі — 930 вучняў, якія будуць займацца ў 42 класах. Тут размясціліся два камп'ютарныя класы, два лінгафонныя кабінеты, лабараторыі біялогіі, фізікі і астраноміі, актавая зала амаль на 300 месцаў. Ёсць месца і для заняткаў спортам: гульнявая зала, трэнажоры, басейн. Размешчана школа ў новым мікрараёне жылой забудовы горада. Два гады таму тут увялі ў строй сучасны дзіцячы садок на 330 месцаў.

Сучасна выглядаюць спартыўныя залы і інфармацыйна-тэхнічны цэнтр — бібліятэка. Сталовая больш нагадвае ўтульнае кафэ, разлічанае на 324 пасадачныя месцы. Кухары абяцаюць, што ежа таксама будзе смачнай і разнастайнай.

Па-новаму выглядае і Цэнтр бяспекі МНС. З дапамогай трэнажораў-стымулятараў школьнікі могуць адпрацаваць

Фота БелТА.

навыкі ратавання людзей, карыстання сродкамі пажаратушэння, эвакуіравання з задымленага памяшкання і гэтак далей.

А яшчэ дзеці змогуць у вольны час займацца харэаграфіяй.

Старшыня Мінаблвыканкама даў наказ моладзі: «Шануйце той час, які вы праводзіце ў школе. Мяркую па сабе. Мне гэтак жа казалі бацькі. І гэта не заўсёды было зразумела. Але праз гады прыходзіць усведамленне, што гэта быў найлепшы перыяд». Пасля ўрачыстай часткі мерапрыемства Аляксандр Турчын уручыў установе адукацыі сертыфікат на 20 тысяч рублёў.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Напярэдадні

Як і дзе адзначым дзень нараджэння сталіцы?

Рыцарскія турніры, квэсты, кірмашы і феерверкі

Штогод у другую суботу верасня ў Мінску адзначаецца важнае і любімае свята — Дзень горада. Сёлета беларускай сталіцы споўніцца 957 гадоў. Асноўныя мерапрыемствы адбудуцца ў суботу 14 верасня, але святкаваць пачнём крыху раней. Праграма, як і заўсёды, абяцае быць даволі насычанай. Пра тое, якія лакацыі падрыхтавалі для жыхароў і гасцей сталіцы, абмеркавалі на пасяджэнні ў Мінскім гарвыканкаме. Карэспандэнт «Звязды» сабраў важныя звесткі пра тое, куды можна схадзіць і на што цікава паглядзець.

«МІНСКІ МАЙСТАР» І ДНІ ЕКАЦЯРЫНБУРГА

«Жыхароў і гасцей сталіцы чакае больш за 100 насычаных мерапрыемстваў. У Мінскай гарадской ратушы 10 верасня адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання мінчан, якія актыўна ўдзельнічаюць у ахове грамадскага правапарадку і прафілактыцы правапарушэнняў. Найлепшыя з найлепшых будуць узнагароджаны заахвочваннямі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, пракуратуры горада Мінска і ГУУС Мінгарвыканкама, — распавяла **начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Кацярына ЛУЧЫНА.** — У канцэртнай зале «Верхні горад» 13 верасня будуць падведзены вынікі гарадскога конкурсу «Мінскі майстар».

«Конкурс «Мінскі майстар — 2024» прайшоў сярод прадстаўнікоў 39 найбольш масавых прафесій: кіроўца (аўтамабіля, тралейбуса, трамвая, пагрузчыка), прадавец, токар, урач, настаўнік, ратавальнік-пажарны, сацыяльны работнік, швачка, прыбіральшчык тэрыторый, рабочы зялёнага будаўніцтва, цырульнік, паштальён і інш.). У конкурсах па дадзеных прафесіях узялі ўдзел больш за 1,5 тысячы работнікаў. Сярод пераможцаў — 11 чалавек ва ўзросце да 31 года», — адзначыла начальнік упраўлення культуры.

Таксама ў Мінску ў гэты дзень пройдуць дні горада Екацярынбурга. Яны будуць уключаць выставу расійскага мастака Аляксея Яфрэмава ў галерэі Міхаіла Савіцкага, а таксама выставу пра гісторыю горада ў адным з філіялаў Музея гісторыі Мінска. Акрамя таго, чакаецца канцэртная праграма з удзелам калектываў з Екацярынбурга на плошчы Свабоды. У адной з бібліятэк Мінска будзе створаны тэматычны куток Екацярынбурга.

У гасцініцы «Вікторыя Алімп Атэль» 13 верасня будзе праходзіць Міжнародны форум эканамічнага супрацоўніцтва. У рамках форуму адбудзецца пленарнае пасяджэнне, будуць працаваць дзве секцыі. У форуме возьмуць удзел каля 200 чалавек.

ГОРАД СТАРАЖЫТНЫ, ГУБЕРНСКІ, РЫЦАРСКІ

Па словах начальніка ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама, галоўныя святочныя ўрачыстасці ў сталіцы пройдуць 14 верасня: «Адкрыце святочныя мерапрыемствы ўрачыстая цырымонія ўскладання кветак да абеліска «Мінск — горад герой». Канцэпцыя цырымоніі ўскладання будзе заснавана на раскрыцці тэмы «Гістарычная памяць у традыцыях пераемнасці пакаленняў». Ва ўскладанні кветак возьме ўдзел кіраўніцтва горада, члены замежных дэлегацый, структурныя падраздзяленні Мінгарвыканкама, кіраўнікі і супрацоўнікі праваахоўных органаў, адміністрацыі раёнаў, кіраўнікі і актыў мінскіх гарадскіх арганізацыйных структур грамадскіх аб'яднанняў.

У цэнтральнай частцы горада на зялёнай зоне скрыжавання праспекта Пераможцаў — праспекта Машэрава ў 10.30 адкрыецца фестываль гістарычнай рэканструкцыі «Мінск старажытны». «Гэта тэатралізаванае, відовішчнае, інтэрактыўнае дзеянне з удзелам клубаў гістарычнай рэканструкцыі. Праграма фестывалю будзе насычана мерапрыемствамі, якія найбольш поўна перададуць атмасферу рыцарскага турніру, перацякаючы з аднаго захапляльнага спаборніцтва ў іншае. Зможам прасякнуцца духам гісторыі пачынаючы з XIII стагоддзя і заканчваючы перыядам Вялікай Айчыннай вайны», — адзначыла Кацярына Лучына.

На тэрыторыі Траецкага прадмесця і Верхняга горада разгорнецца «Мінск губернскі». Жыхароў і гасцей горада будуць сустракаць касцюміраваныя персанажы XVIII—XIX стагоддзяў. Ахвотныя змогуць пакатацца на карэтах, паўдзельнічаць у інтэрактыўных мерапрыемствах і паслухаць жывую музыку адпаведных гістарычных перыядаў. А на пляцоўцы каля Ратушы з 12.00 да 15.00 запланавана канцэртная праграма «Хіты Прэзідэнцкага аркестра».

Фота БелТА.

АЛІМПІЙЦЫ І РАТАВАЛЬНІКІ

Сумесна з Нацыянальным алімпійскім камітэтам на пляцоўцы каля Палаца спорту 14 верасня будзе арганізаваны Алімпійскі дзень. «Урачыстая цырымонія яго адкрыцця адбудзецца ў 12.00. У спартыўным свяце чакаецца ўдзел беларускіх спартсменаў, пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх турніраў. Прадугледжана размяшчэнне больш як 30 спартыўных і забаўляльных пляцовак. Удзельнікі алімпійскага дня змогуць выпрабаваць свае сілы ў баскетболе, боксе, барацьбе, веласпорце, валейболе і іншых відах спорту», — распавяла Кацярына Лучына.

Спартыўныя конкурсы для дзяцей ад 3 да 14 гадоў пройдуць у фармаце алімпійскага квэсту. «У рамках мерапрыемства плануецца арганізаваць канцэртную праграму з удзелам маладзёжных творчых калектываў і артыстаў беларускай эстрады. Таксама прапрацоўваецца пытанне ўдзелу ў канцэртнай праграме хэдлайнера», — адзначыла начальнік упраўлення культуры.

Таксама на пляцоўцы каля Палаца спорту з 8.00 да 18.00 пройдуць міжнародныя спаборніцтвы «Наймацнейшы пажарны-ратавальнік». «Удзел возьмуць пажарныя-ратавальнікі абласных (Мінскага гарадскога) упраўленняў па надзвычайных сітуацыях, Універсітэта грамадзянскай абароны МНС, рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР». Акрамя таго, запрашэнні аб удзеле ў спартыўным першынстве накіраваны прадстаўнікам МНС Расіі, Казахстана, Узбекістана, а таксама Міністэрства грамадскай бяспекі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам», — дадала Кацярына Лучына.

СЕЛЬГАСКІРМАШЫ І ФЕЕРВЕРКІ

Сёлета ўлады Мінска вырашылі не парушаць традыцыю і даць старт кірмашам па продажы сельскагаспадарчай прадукцыі ў сярэдзіне верасня. Асноўнай лакацыяй для правядзення сельскагаспадарчых кірмашоў у 2024 годзе застанецца пляцоўка каля «Чыжоўка-Арэны». Гэтае месца даўно палюбілася гараджанам. Сюды зручна пад'язджаць, тут даволі прасторна для размяшчэння вялікай колькасці ўдзельнікаў. З улікам таго, што ўлады горада прывыклі ярка і маштабна адкрываць сельскагаспадарчыя кірмашы, і ў сувязі з тым, што Дзень горада сёлета таксама выпадае на 14 верасня, было прынята рашэнне падоўжыць мінчанам свята.

Па традыцыі на працягу амаль усёй восені ў Мінску будуць працаваць штодзённыя пляцоўкі па рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі фізічнымі асобамі, сялянскімі і фермерскімі гаспадаркамі. Гэтыя лакацыі будуць функцыянаваць два месяцы: з 16 верасня да 17 лістапада.

Кірмашы, якія будуць праходзіць ва ўсіх адміністрацыйных раёнах Мінска, не адкрыюцца адначасова. Напрыклад, сезон на пляцоўцы каля Палаца спорту — яшчэ адным папулярным у жыхароў сталіцы месцы закупак прадукцыі беларускіх аграрыяў — стартуе 21 верасня. Працягнецца сезон сельскагаспадарчых культур у 2024 годзе да сярэдзіны лістапада. Але свае карэктывы можа ўнесці надвор'е: калі тэмпература стане стабільна мінусавай раней, то кірмашы спыняцца.

Пералік абяцае быць вельмі разнастайным. Часцей за ўсё на кірмашах прапаноўваюць таксама лекавыя травы, грыбы, арэхі, дзікаросы, прадукцыю пчалярства і жывёлагадоўлі. Арганізатары нагадваюць: усё гэта фізасобы могуць рэалізоўваць без выплаты адзінага падатку. Праўда, ёсць некалькі нюансаў. Напрыклад, забараняецца продаж малочных прадуктаў, якія не прайшлі ветэрынарна-санітарную экспертызу. А вось пры рэалізацыі мёду і прадукцыі пчалярства патрабуецца даведка, што ўсё гэта выраблена ў Беларусі.

У вячэрні час з 19.00 да 21.00 на плошчы Свабоды адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўручэння ўзнагарод «Мінчанін года» ў суправаджэнні заслужанага калектыву Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь. Таксама 14 верасня плануецца арганізаваць сямейнае свята ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага. Там пройдуць дзіцячае свята і выстава рэтрааўтамабіляў. Музычна-піратэхнічнае феерверк-шоу можна будзе ўбачыць на пляцоўцы каля Палаца спорту ў 23.00.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

СЭРЦЫ, АДКРЫТЫЯ

І СТАЛЫМ, І ЮНЫМ

Адной з адметнасцяў сёлетняга Дня пісьменства, якое прайшло пад знакам 80-годдзя вызвалення Беларусі, 30-годдзя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, 30-годдзя інстытута Прэзідэнцтва ў Рэспубліцы Беларусь, Года якасці, я б назвала актыўны ўдзел дзяцей на розных пляцоўках.

Ім, юным, прысвячалася шмат мерапрыемстваў. Яны, напрыклад, прымалі ўдзел у конкурсе чытальнікаў і адкрыцці арт-аб'ектаў, яны разам са сваімі настаўнікамі прадстаўлялі школьныя музеі, удзельнічалі ў фестывалі кнігі і прэсы. Менавіта на гэтым фестывалі ўвагу прыцягнула пляцоўка музея імя Валянціна Таўлая сярэдняй школы № 4 Баранавічаў. Аказалася, што названы літаратурна-краязнаўчы музей, адзіны сярод школьных музеяў Баранавічаў, носіць званне «народнага». А паэта, публіцыста, грамадскага дзеяча Валянціна Таўлая шануюць у горадзе, яго імя носяць вуліца і некалькі завулкаў. Вучні са сваёй настаўніцай, шматгадовай захавальніцай музея Нінай Шавель, хораша расказвалі пра земляка, школьнікі з задавальненнем дэкламавалі радкі паэта: « Адчыняйце, хаты, людзі! // Адчыняйце сэрцы, людзі! // Вясна будзе! Вясна будзе!»

Побач іншыя школьнікі — з вёскі Парэчча Пінскага раёна — паказвалі невялікую экспазіцыю свайго школьнага музея, прысвечанага Яўгеніі Янішчыц. Вучні 9 класа пранікнёна, можна сказаць, з любоўю апавядалі пра свой музей, паказвалі ўнікальныя экспанаты, асабістыя рэчы паэтэсы,

столінскія прыгажуні, дарэчы, шматдзетныя матулі. Адным словам, цікавосткі былі на кожным кроку.

ЗНАКАВЫЯ АБ'ЕКТЫ ПАДРЫХТОЎКІ

А гараджане адзначалі вялікую работу па добраўпарадкаванні Іванцэвічаў. Жыхарка райцэнтра, шматдзетная мама Аксана Краўчэня падкрэсліла як станоўчы той факт, што пры падрыхтоўцы горада да святкавання адказныя асобы памяталі пра

дэкламавалі радкі і нават паабяцалі карэспандэнту «Звязды» праз год правесці такую ж экскурсію на роднай мове.

Былі і іншыя прадстаўнікі школ Брэстчыны, некаторыя з іх зазіралі ў павільён Выдавецкага дома «Звязда», удзельнічалі ў віктарынах і латарэях, атрымлівалі сувеніры на памяць. Усё гэта, несумненна, радуе, бо звышзадача грамадства сёння — прыцягнуць маладое пакаленне да кнігі, абудзіць яго цікавасць да літаратурных герояў.

Любая лакацыя свята выклікала цікавасць, прываблівала інфармацыяй, новымі ведамі. Можна было зайсці ў імправізаваны павільён-палатку і застацца надоўга. Так, напрыклад, здарылася з аўтарам гэтых радкоў пры наведванні тэматычнай пляцоўкі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Галоўны бібліятэкар сектара арганізацыі кніжных выстаў Святлана Зайко паказала ўнікальныя выданні нашых беларускіх выдавецтваў апошніх дзесяцігоддзяў. Інтэрактыўная пляцоўка «Слова пісьменніка» давала магчымасць пазнаёміцца з членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі, пачуць вершы або ўрыўкі з прозы ў аўтарскім выкананні. А ў павільёне БелТА гіравік Вячаслаў Харанека дэманстраваў сваё майстэрства і праводзіў майстар-клас для ахвотных. Увечары пад яго кіраўніцтвам паспрабавалі свае сілы нават і высокія госці свята. А вось пляцоўка Беларускага саюза жанчын была прысвечана ідэі шматдзетнасці. Там актыўнічалі дзяцей, пра камфорт вучэбнага і выхаваўчага працэсу. Сведчаннем таму стала адно з мерапрыемстваў у шэрагу ўрачыстых адкрыццяў аб'ектаў: у суботу прэзентавалі абноўленую спартыўную пляцоўку ў школе № 1 райцэнтра.

А для таго, каб гэтая імпрэза адбылася напярэдадні Дня ведаў, будаўнікі шчыравалі некалькі месяцаў. На школьным стадыёне рэканструявалі трыбуны, замянялі лаўкі, на адной з пляцовак зрабілі мяккае пакрыццё. Папярэднюю баскетбольную пляцоўку перабсталявалі ў шматфункцыянальную. Бяспечнае пакрыццё паклалі на стаметровай бегавой дарожцы. І апошняй разыначкай спартыўнага комплексу, яго сапраўдным упрыгажэннем стаў мурал з выявамі спартсменаў. На тэрыторыі абноўленага стадыёна цяпер могуць займацца фізкультурай не толькі вучні названай школы, але і іншых устаноў адукацыі горада. Тут нават магчыма праводзіць розныя спаборніцтвы.

Вучняў, іх бацькоў і настаўнікаў з гэтай падзеяй павіншаваў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК**. Губернатар адзначыў, што тут створаны ўмовы для ўмацавання здароўя дзяцей: «Разам мы павінны рабіць усё, каб у нас расло здаровае пакаленне, каб дзеці змалку любілі спорт, развіваліся ў спорце, а затым дасягалі высокіх вынікаў нават на міжнароднай арэне».

Кіраўнік вобласці падарыў сертыфікат на набыццё тэлевізара, а таксама інвентару для камандных відаў спорту.

Падчас адкрыцця спартыўнай пляцоўкі таксама згадвалася, што першая школа да навучальнага года абнавілася цалкам, рамонт праведзены ў актавай зале, харчовым блоку, вучэбных кабінетах.

Падарункам жыхарам Івацэвіцкага раёна ўсіх пакаленняў стаў кабінет камп'ютарнай тамаграфіі ў раённай бальніцы. Яго таксама ўрачыста адкрылі падчас святкавання. Варта сказаць, што ўстанова аховы здароўя пяражыла сур'ёзны рамонт. Усе работы былі выкананы ў сціслыя тэрміны. А нядаўна быў завезены сучасны апарат КТ. Як паведаміў галоўны ўрач ЦРБ Васіль Юзэфовіч, апарат вельмі патрэбны бальніцы. Бо, напрыклад, летась 580 разоў давялося вазіць пацыентаў на тэрміновыя абследаванні ў іншыя гарады. А Пётр Пархомчык адзначыў пры гэтым, што на развіццё аховы здароўя Брэсцкага рэгіёна чарговы раз выдзелены вялікія сродкі.

Значныя сродкі былі асвоены ў ходзе падрыхтоўкі і на іншых аб'ектах. Апошняе падкрэслівалі ў гутарцы з карэспандэнтам газеты і жыхары раёна. Напрыклад, рамесніца Анжаліка Шыманчык, вельмі ўдзячная за адрамантаваную бібліятэку, сказала, што цяпер сюды заходзіш, нібы ў храм кнігі. Сама Анжаліка Мікалаеўна прадстаўляла ў горадзе майстроў свае ўнікальныя габелены, выраблены з траў. Яе духмяныя творы прыцягвалі не толькі выглядам, але і пахам.

Раённая бібліятэка імя Піліпа Пестрака сапраўды пяражыла істотнае абнаўленне. На святе бібліятэку акрамя яе супрацоўнікаў прадстаўлялі і юныя чытальнікі з вершамі нашых класікаў. Прыгожым, надзвычай сімвалічным момантам святкаванняў стала адкрыццё арт-аб'екта «Кнігі, якія лунаюць». Кампазіцыя ўяўляе сабой дзесяць разгорнутых кніг, якія нібы ляцяць у паветры, на кожнай змешчана цытата вядомага пісьменніка. Побач — утульная лаўка і ліхтары ў выглядзе газетных скруткаў. Аўтар гэтага арт-аб'екта — каваль з Віцебшчыны Юрый Татарыновіч. «Кнігі, якія лунаюць, сімвалізуюць вечны рух думак, што аўтары ўвасобілі на старонках сваіх твораў», — так сказаў вядучы цырымоніі адкрыцця.

СІМВАЛ ПАМЯЦІ — ГОЛУБ МІРУ

Адным з найважнейшых момантаў свята стала ўскладанне кветак да помніка воіна на брацкай магіле ў скверы Перамогі, а таксама да памятнага знака спаленым вёскам. У цырымоніі прынялі ўдзел **намеснік прэм'-ер-міністра краіны Ігар ПЕТРЫШЭНКА, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК**, прадстаўнікі органаў кіравання і грамадскіх арганізацый, дэпутаты, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса. Усе разам хвілінай маўчання ўшанавалі памяць абаронцаў і ахвяр вайны.

Затым ваенна-гістарычныя рэканструктары паказалі некалькі эпізодаў вызвалення Івацэвічаў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 годзе, а таксама партызанскую барацьбу. Далёка за межамі раёна вядомая партызанская база ва ўрочышчы «Хаваншчына», дзе выходзіла падпольная газета «Заря». Тут яшчэ быў сямейны лагер і працавала партызанская школа.

Таму выглядае сімвалічным, што менавіта тут, у Івацэвічах, да Дня беларускага пісьменства ўстанавілі кампазіцыю «Дзеці лясной школы». Яна ўяўляе сабой хлопчыка і дзяўчынку з партызанскага атрада, якія трымаюць кнігу. Скульптура заклікана нагадваць цяперашнім вучням аб тым, што іх равеснікі нават у ліхія ваенныя гады цягнуліся да ведаў. Сімвалічным выглядае і той факт, што адкрыць скульптуру, зняць з яе традыцыйную заслону даручылі найлепшым вучням — стабальнікам гэтага года.

Цырымонія адкрыцця «Дзяцей лясной школы» атрымалася прыгожай, запамінальнай. Малодшыя школьнікі чыталі вершы, хорам заклікалі: «Таварыш! Сягоння ў нас думы адны: // Мір нам патрэбен, // Не трэба вайны!» І пасля гэтага выпусцілі ў неба галубоў — птушак міру. А потым... Усеагульнае замілаванне, аж да дрыжыкаў, выклікала з'ява, падобная на цуд, калі адзін галубок зрабіў круг у паветры, вярнуўся і сеў на кнігу паміж гэтымі скульптурнымі хлопчыкам і дзяўчынкай. І нездарма ж потым многія выступоўцы згадвалі гэтую мілую карцінку як глыбокі сімвал свята.

ГЛЫБІННАЯ СУТНАСЦЬ СВЯТА

Афіцыйная цырымонія адкрыцця XXXI Дня беларускага пісьменства адбылася ўвечары на галоўнай плошчы горада. Віншаванне Прэзідэнта краіны гасцям і ўдзельнікам свята зачытаў намеснік прэм'-ер-міністра Ігар Петрышэнка.

«Гэтае свята нагадвае нам аб важнасці захавання і развіцця праз кнігу нацыянальнай культурнай спадчыны, духоўных традыцый народа — гаворыцца ў віншаванні. — Такія каштоўнасці яднаюць людзей і спрыяюць росквіту краіны. Літаратура і матчына мова былі і застаюцца падмуркам у выхаванні высокіх маральных якасцяў, фарміраванні грамадзянскасці».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

СЛОВУ

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што беларусы заўсёды будуць з павагай ставіцца да нашага гістарычнага здабытку, берагчы невычэрпныя культурныя скарбы продкаў, штодзённай працай умацоўваць суверэнітэт дзяржавы, шанаваць нашу мову і славутых майстроў слова, песняроў роднай зямлі.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр Пархомчык прывітаў гасцей і ўдзельнікаў на гасціннай брэсцкай зямлі: «Пяты раз Брэстчына становіцца гаспадыняй Дня беларускага пісьменства, — сказаў губернатар. — Нам прыемна сустракаць літаратараў, навукоўцаў, дзеячаў культуры, усіх гасцей, якія сабраліся ў прыгожым беларускім куточку, каб ушанаваць роднае слова і

нашу духоўную спадчыну. У нас ёсць што паказаць, ёсць чым ганарыцца. У нас кожныя раён, пасёлак, вёска маюць асаблівы каларыт, свае абрады, маюць таленавітых землякоў, якія праслаўляюць родныя мясціны».

Кіраўнік вобласці адзначыў, што мы шануем усе нашы духоўныя здабыткі, сярод якіх — інтарэс да кнігі і літаратурнага слова, і бачым сваёй задачай зберагчы іх і перадаць падрастаючаму пакаленню.

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, павіншаваў прысутных з Днём беларускага пісьменства і пажадаў, каб яно стала святам высокай культуры і духоўнасці, а таксама нагадаў, што глыбінная сутнасць свята мае дачыненне да Слова: «Слова, мова, пісьменства ад самага пачатку з'яўляюцца выключным дарам Божым чалавеку. І ўсе мы павінны арыентавацца на той самы вышэйшы змест слова». Мітрапаліт заклікаў звярнуць увагу на чысціню і асэнсаванасць кожнага нашага слова — і напісанага, і таго, якое зыходзіць з нашых вуснаў: «Словам можна натхніць на подзвіг, але можна і абразіць. Добрае слова нават у самых безнадзейных абставінах здольнае вярнуць да жыцця. Слова валодае вялізнай творчай сілай, раскрыць якую важна таму, хто жыве словам і працуе са словам. Чым чысцейшыя будуць словы, якія мы прамаўляем, тым чысцейшымі і багацейшымі будуць нашы сэрцы і нашы розумы і прыгажэйшай наша краіна», — сказаў уладыка Веніямін.

Па традыцыі падчас адкрыцця свята прайшла цырымонія ўшанавання пераможцаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Віншуючы пісьменнікаў, **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ** пажадаў лаўрэатам, якія ўдастоены ўзнагарод, каб іх імёны з часам увайшлі ў гісторыю: «Беларусі заўсёды былі патрэбны людзі, якія ўмеюць гаварыць прыгожыя, разумныя, сумленныя словы. Словы, якія застануцца ў гісторыі назаўсёды».

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ выказаў спадзяванне, што творчы патэнцыял, які відаць у творах сёлетніх лаўрэатаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі, акажа ўплыў на светлую будучыню краіны.

Вечар закончыўся святочным канцэртам і феерверкам. А ў нядзелю святкаванне працягвалася. На галоўнай сцэне прайшло мерапрыемства, арганізаванае Саюзам пісьменнікаў Беларусі, у якім узялі ўдзел літаратары з усёй краіны. Затым узнагародзілі пераможцаў рэспубліканскага творчага конкурсу Міністэрства інфармацыі і Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму сярод журналістаў СМІ на тэму ўборачнай кампаніі-2024 «Хвала рукам, што пахнуць хлебам».

А падчас афіцыйнага закрыцця Дня беларускага пісьменства гаспадары перадалі эстафету наступнікам. У 2025 годзе свята пройдзе ў Лідзе. **Старшыня Іванцэвіцкага райвыканкама Уладзімір БЯЛОЎ** перадаў вымпел свята **старшыні Лідскага райвыканкама Сяргею ЛОЖАЧКІНУ**.

— Гэтыя два дні для Іванцэвічаў сталі яркімі, насычанымі, незабыўнымі, — сказаў Уладзімір Бялоў. — Свята аб'яднала нас такімі духоўнымі сімваламі, як кніга і слова. У жыхароў райцэнтра застануцца не толькі прыемныя ўспаміны і ўражанні, але і добраўпарадкаваны горад. Мы рады, што ў змястоўнай і насычанай праграме свята здолелі прадэманстраваць самабытную культуру Іванцэвіцкага раёна і першага рэгіёна ў цэлым.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

СУМЛЕННЫЯ СЛОВЫ ДЛЯ ГІСТОРЫІ

Заканамерна, калі ў Год якасці вызначаюцца і самыя якасныя літаратурныя творы. Менавіта так адбылося падчас уручэння Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў Іванцэвічах падчас Дня беларускага пісьменства. Гэтая самая прэстыжная ўзнагарода для літаратара ў нашай краіне была зацверджана ў 2015 годзе, а цырымонія ўзнагароджвання лаўрэатаў стала ўжо яркай і чаканай часткай Дня беларускага пісьменства. На галоўнай сцэне ўрачыста адкрываюцца канверты, гучаць імёны лаўрэатаў, а для чытачоў з'яўляецца арыенцір — якія кнігі ў найбліжэйшы час варта знайсці на паліцах кнігарняў і бібліятэк.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Сёлета на конкурс было пададзена каля пяці дзясяткаў творчых прац — і гэта ўжо толькі тыя працы, якія прайшлі папярэдні адбор. **Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Марат МАРКАЎ** недарэмна адзначыў, што Беларусь заўсёды была багатая на пісьменнікаў і паэтаў.

— Вы ведаеце гэтыя імёны, я іх не буду называць. Некаторым з іх сёння былі прысвечаны стэнды. Я проста хачу пажадаць лаўрэатам, якія будуць атрымліваць узнагароды, каб іх імёны таксама ўвайшлі ў гісторыю.

Пераможцаў вызначалі ў шасці намінацыях. У намінацыі «Найлепшы твор, зборнік твораў паэзіі» перамог Хведар ГУРЫНОВІЧ, які жыве і працуе ў Салігорску, з кнігай «Паляўнічая паэма». Хведар Гурыновіч — добры знаўца роднай прыроды, яго кнігі шмат гадоў далучаюць чытача да разумення каштоўнасці прыродных скарбаў Беларусі.

Намінацыя «Найлепшы твор прозы» традыцыйна прыцягвае ўвагу, тым болей сёлета яна адна з самых багатых на заяўкі. Тут перамог Віктар КУНЦЭВІЧ са зборнікам аповесцяў, апавяданняў і абразкоў «Калі чужая душа — твая».

Найлепшым творам публіцыстыкі прызнана кніга Сяргея МІХОВІЧА «Нам силы даёт земля». На старонках кнігі чытач сустрэнецца з рэальнымі людзьмі, якія працуюць на зямлі, з патрыётамі Айчыны.

Літаратуразнаўца Мікола МІКУЛІЧ — вядомы прафесіянал, яго даследаванні, у тым ліку біяграфіі і творчасці Максіма Танка, даўно карыстаюцца папулярнасцю. Таму заканамерна, што ў намінацыі «Найлепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства» ён перамог са сваёй новай кнігай, прысвечанай народнаму паэту — «Максім Танк. Асоба, паэзія, лёс».

Традыцыйна ў намінацыі «Найлепшы твор для дзяцей і юнацтва» — самае вялікае спаборніцтва. Пераможца ў гэтай намінацыі, паэт Уладзімір МАЗГО, даўно сцвердзіў сябе як таленавіты і плённы аўтар кніг для дзяцей. Нацыянальную літаратурную прэмію аўтару прынесла кніга «Загадка — розуму зарадка».

Намінацыя «Дэбют» — адна з самых складаных для журы, былі гады, калі яе нават не прысуджалі. На гэты год выбіраць было з чаго, і найлепшай з найлепшых стала Алеся КУЗНЯЦОВА, аўтар кнігі «Когда трещит лед».

Усіх аўтараў, уганараваных прэстыжнай літаратурнай узнагародай краіны, пры ўсёй іх рознасці, аб'ядноўвае адно — любоў да роднай зямлі, павага да традыцый, што закладзены ў нацыянальнай літаратуры слыннымі папярэднікамі. Пра важнасць захавання гэтых традыцый казаў і **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ**.

— Спадзяюся, творчы патэнцыял, які бачны ў творах сённяшніх лаўрэатаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі, паўплывае на нашу светлую будучыню, — зазначыў ён.

Людміла ІВАНОВА.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ВЕЧАР ЧАРГІНЦА ПРАЙШОЎ У ІВАЦЭВІЧАХ

У межах праграмы XXXI Дня беларускага пісьменства ў Іванцэвічах прайшоў творчы вечар народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца.

Перапоўненая зала чытачоў, прыхільнікаў творчасці вядомага літаратара, ганаровага старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі ў Іванцэвіцкім раённым Палацы культуры складалася з розных катэгорый людзей цікаўных да мастацкага слова. Вёў сустрэчу старшыня Саюза пісьменнікаў, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч. Ён і расказаў пра асноўныя творчыя этапы ў лёсе вядомага літаратара, пра яго мастацкія здзяйсненні, пра няпростыя жыццёвыя выпрабаванні, праз якія давялося прайсці Мікалаю Іванавічу. Увазе ўдзельнікаў сустрэчы быў прадстаўлены дакументальны фільм, прысвечаны М. Чаргінцу.

Народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч прачытала ўрыўкі з раманаў народнага пісьменніка — «Сыны» і «А ён не вярнуўся з боя». Мікалай Іванавіч падзяліўся ўспамінамі пра тое, як нараджаліся гэтыя творы, таксама расказаў, як прафесійна займаўся ў маладосці спортам, як прыйшоў на службу ў праваахоўныя органы, згадаў сваю службу ў Афганістане.

На творчым вечары выступіў і кінарэжысёр, член прэзідыума Беларускага саюза кінематаграфістаў Сяргей Гіргель. А народны артыст Беларусі, славуты кампазітар, аўтар мноства папулярных песень Эдуард Ханок выканаў вядомыя хіты.

Сяргей ШЫЧКО.

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор аукциона/оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by
Продавец	СООО «БЕЛВИНГРУПП», г. Минск, ул. Нахимова, 20, к. 402. УНП 800009596

Предмет электронных торгов – изолированное помещение (складское помещение), инв. № 710/D-79585, общ. пл. 1079,5 кв. м, по адресу: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Горелика, 508-1. Начальная цена, с НДС 20 % – 50 000,00 долл. США***

*Примечание: цена продажи предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

** Для заключения договора купли-продажи необходимо будет предоставить документы согласно Регламенту административной процедуры, осуществляемой в отношении субъектов хозяйствования, по подпункту 2.8.7 «Получение документа о согласии на получение в собственность, пользование или во владение, в том числе на основе договора финансовой аренды (лизинга), хозяйствующим субъектом находящегося на территории Республики Беларусь имущества, которое является основными средствами и (или) нематериальными активами коммерческой организации»

Задаток 15 000,00 бел. руб. от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92-BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 60 (шестьдесят) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

